1

Станцыя не змяніла свайго выгляда.

Як і шэсць год таму назад, была яна маленькай, негаманлівай, з тым-жа невялічкім халодным і ўлетку і ўзімку пасажырскім пакоем, з вечна рыплівымі дзвярмі, з нязменным сторажам Палікарам, які ходзіць вот, тупае па ўсіх пакоях, па вузенькаму перону. Ходзіць заклапочаны сваімі вечнымі турботамі: лямпы патушыць, каторыя залішнія, прыкруціць кнот, каб не дужа «люмінацыі» тон, і так газы ідзе той, не лямпы, а прожары. Ізноў-жа эканомія. Раз прыкруці, два прыкруці,—глядзі, і набяжыць якая грыўня за месяц, а гэта ўжо верны прыбытак, на шапку катораму малому там, ці на штаны. Ізноў-жа Палікар і насільшчык, і прыёмшчык багажа, ён-жа і пошту дапамагае здаць і прыняць. Адным словам, майстра на ўсе рукі. І не дзіва, калі пасля лішняе соткі часам заўзята спрачаецца Палікар з худым бялёсавокім тэлеграфістам.

— Ты на мяне не глядзі, што я, можна сказаць, у адной кампаніі з табой чарку п'ю. З тэлеграфістам якім-небудзь задрыпаным... Я, брат, усё магу: і сцэпку магу, і на дрывакладa, калі хочаш, ізноў-жа і стрэлку, калі трэба, і жазло прыняць, а хочаш, дык і багажную квітанцыю выпішу...

— Ну, падумаеш, квітанцыю... Тры пуды, скажам, паставіў і ўсё табе. Ты дыпэшу паспрабуй выстукаць.

— Дыпэшу, кажаш? А на ліха-ж вы, жоўтакантныя, будзеце. Нашоў прамудрасць. Уся навука ваша ў пальцы адным, адным пальцам, можна сказаць, хлеб калупаеце. А я вот і ў звон магу ўдарыць. І раз удару, і два ўдару, а захочу і тры...

— А чатыры не стукнеш.

— Магу і чатыры стукнуць...

— А вот-жа не стукнеш.

— Каб закон на тое, ударыў-бы і ў чатыры, а па закону толькі тры. Чацверты, брат, без патрэбы, чацверты, гэта ўжо штраф, глядзі правілы...

— Нехта-ж правілы твае папёр.

— А гэта, брат, сляпы не дагледзеў...

Калі трапляецца тут сляпы—жабрак Сільвестр—векавуе на станцыі, начуе на багажнай лаве, а зімой зашываецца бліжэй да групкі—ён пратэстуе звычайна:

— А ты не мані, што не дагледзеў. Я, брат, бачыў, чуў гэта, значыцца, як сам начальнік падышоў гэтак да сцяны ціхесенька. Толькі чую: кульгель, кульгель—гэта ўсё пасля таго, як машыніст Андрэй яго жазлом па каленцы цяпнуў, дык і пакульгвае крыху... Дык вот падышоў і раму здымае. Ды 'шчэ й кажа мне:

— Гэта я, Сілівей, не турбуйся, значыць, бо усёроўна правілы гэтыя нікому не патрэбны, ды й прачытаць-жа іх існуўтакі цяжка з-за мушынай той прыкрасці. А рамкі нішто, дубовыя рамкі. У самы раз пад сям'ю будзе царскую... А ты, не дагле-едзеў... Я не дагледжу.

І сапраўды найленшы памочнік Палікара сляпы. Прашоў які цягнік і Палікар да Сілівея:

— Ты ўжо тут паглядзі за парадкам, а я хіба дахаты збегаю, жонкі даведаюся...

Ці проста:

— Не адлучайся нікуды, спаць пайду пад бярозу, дужа-ж сон змарыў...

— А што там, ідзі сабе...

Палікар, тэлеграфіст, ды сляпы Сілівей—і ўвесь немудроны штат невялічкае станцыі. Ды й то Сілівей, так сказаць, звыш штата. Хіба вот начальнік станцыі яшчэ, да жандар Мікіта Сухон. Але-ж начальнік не да кампаніі, усё-ж начальнік як-ні-як, шапка ў яго чырвоная, а жандар больш ракамі займаецца ды півам. Ды існуў-жа—гаспадзін жандар, а то й ваша благароддзе, яму й пад казырок бяры. Ды й характар у яго не зусім, каб дружацкі. Вот прыгледзіць дзе ў кутку і давай экзамен наладжваць:

— А ну, сляпы, падыходзь на дыстанцыю. А ну, адказвай, ды каб адразу: які поўны цітул яго імператарскае вялічасці? А хто я тут ёсць? А хто такія, скажам, нутраныя ворагі? І што рабіў-бы ты на маім мейсцы, убачыўшы гэтага ворага сярод пасажыраў?

І калі першым разам адказаў было сляпы адным махам:

– А я-б яму салаўём запеў, верная грыўня ў кішэні (вялікі спец Сілівей на той свіст салаўіны, на прамудрыя тыя каленцы салавейкавы).

Спахмурнеў тады Сухон і лупануў такі разы са два сялёдкай па сухіх Сілівеявых рэбрах.

— Балда ты, можна сказаць, крывая балда. І ніякага ў цябе розуму і паняція. А павінен-бы ты таго ворага за каршэнь узяць, пратакол як след па форме скласці і ў жандарскае ўпраўленне здаслаць... калі вораг у рукі не йдзе, бей па інструкцыі з агнястрэльнага аружжа...

— А калі пры мне няма агнястрэльнага?

— ізноў балда... Не разумееш славеснасці. Уся бяседа з табой для відзімасці адной, каб розуму цябе навучыць. Бо хто, скажам, такую адказную службу, як маю, на цябе ўзложыць: гэта ты разумець павінен. Ізноў-жа сляпы ты, старац, можна сказаць, божага спіса. І трэба-б цябе па ўсіх правілах гнаць з казённага памяшкання і наогул на тэрыторыю не дапускаць, як асобу зусім староннюю. А ты лаву багажную пралежваеш, казённыя кафлі ля групкі праціраеш. І я дапушчаю, хаця і магу ў любы момант, як тлю цябе ізнішчожыць. Напішу вот, што мысля ў цябе дзёрзкая была, выказаўся ты, скажам, пра цара, альбо пра мяне, часам... і ў дваццаць чатыры хвіліны... А я дапушчаю... Няхай, думаю, спіць... Няхай, думаю, ля вагонаў аціраецца, вялікі то мне клопат. А ты адчуваць гэта павінен. І яшчэ як адчуваць... Усёй мысляй і сэрцам.

Сухон навучаў сляпога, навучаў славеснасці. І калі надзкучвала—шоў ракаў лавіць на рачулку, ці садзіўся ў дзяжурнай перапісваць старыя пратаколы «аб безбілетным дзіякане айцы Панкраце», аб «пошуках шапкі жандарскага ротмістра Насядаева, оная, паводле слоў пацярпеўшага, зляцела з цягніка на семнаццатай вярсце і, як відаць з праведзенага дазнання, паднята пастушкамі з вёскі Закарэяўкі, якія оную шапку каравашніку за цукеркі прадалі...», аб «сцэпшчыку Савасцею, які, выпімшы, аблажыў і прыстол божы і царскі род непатрэбнымі словамі і нават царскаму партрэту кукіш выстаўляў...».

Перапісваў пратаколы, «каб цвёрдасць у руках была, каб мысля не іржавела», а была-б заўсёды ў поўным парадку і спраўнасці. «Для гімнастыкі, так сказаць, мазгоў»,—пахваляўся часам начальніку станцыі.

А Сілівей «адчуваў» і калі собіла часам ля вагонаў сабраць капейку лішнюю за тыя каленцы салавейкавы, купляў папярос пачак, каторы паквяцісцей, і, улучыўшы момант зручны, да яго благароддзя:

— Сэрцам і мысляй, можна сказаць, вашаму благароддзю: дужа-ж духавітыя... пачак цэлы...

— А ну, пакаж, тля каторая... Курыць можна... А ну, закуры вот хіба адну, ды адчувай... Ды ідзі, ідзі, дужа мне тут з табой разгаворы разгаварываць...

Гэта калі поблізу людзі.

Так. Не змянілася станцыя.

Ціхая, негаманлівая. Лясы навакол, балаты. Вечарамі сірацеюць агні на стрэлках, паблісквaюць цмяныя і блеклыя (усё кнаты тыя падкручаныя, Палікараў клопат), ды жмурыцца семафорнае вока ў тумановую далеч лагчын, пералескаў, вільготных начных палёў. Тады прыяжджае поезд начны і на хвіліну абуджае сонныя прасторы гулкім рэхам ды гудковымі пагалоскамі, басавітымі, пранозлівымі. Абуджае станцыю на хвіліну, бо ўвесь штат у рабоце—ля звона Палікар, бараду важнецкі пагладжвае. Начальнік ля пачтовага вагона завіхаецца. Сухон падцягвае грудзі—аж пуп трышчыць—і, накручваючы вусы, важна прахаджваецца пад вокнамі вагонаў, сурова прывітаецца з машыністам. На рабоце і сляпы.

... І калі Васіль Панфілавіч, вылязаючы з пракуранага вагона пачуў гэта даўно знаёмае:

— Падайце, гаспада пасажыры, няшчасненькаму, сляпенькаму, каторы, можна сказаць, бязбацькавіч і бязматкавіч, на падтрыманне грэшнае плоці...

Тады падступіў да горла, падкаціўся салодкі камок і здрадліва памакрэлі расніцы.

— Ты, Сілівей? Жыў яшчэ, пяеш, птаха пакгаузная?

— Пяю, гаспадзін, а што? Ці не часам знаёмы які?

— Уга... Колькі то год... Дык на, брат, грыўню, ды йдзі, не марудзь, поезд цябе чакаць не стане... Ідзі, браце, пой... Пой, голуб мой, песня душу чаруе...

Так, чаруе... Вось яна, радзіма, вось яна, бацькаўшчына... І лясы яе, балаты яе непраходныя, лесавыя палі верасковыя, ды дарогі тыя—у вымоінах, у калдобінах, не канём па іх, а больш пехам. Ды па дарогах тых ідзе-паўзе тая доля, сляпая, лахманамі трасе, салаўінымі песнямі выхваляецца. І ў песнях

тых бязмежная шырыня і глухія сцены, адвага і адчай, узлёты ў нябесныя вышыні і каменем на зямлю, на жвір, на жарству, на сухі той пыл прыдарожны.

Так ідзе і кульгае тая доля сляпая, неўміраючая. І песні тыя салаўіныя—сляпыя песні. І жыццё сляпое, як чорная ноч. Такая ўжо бацькаўшчына, такая радзіма.

Ажандараная радзіма...

Не заходзячы на станцыю перашоў Васіль Панфілавіч калеі і пашоў дарогаю, што да горада. Тры вярсты тут усяго, невялікая хада. Ды калі людзі яшчэ, спадарожнікі. Двое салдатаў, ды чалавек яшчэ ў ватоўцы, башлыком захутаны, тырчаць адны рудыя вусы і на іх ледзяныя сусолкі. З салдатаў адзін высокі, сутулісты. Ідзе і па баках не глядзіць, нібы думае аб нечым і калі скажа слова якое, дык слова тое бух, як камень, ды сам тады скоса так пазірае і зноў замаўчыць. У шэрані начной цямравеюць нерухомыя рысы яго твара, застыглыя, нібы скамянелыя. І ўся постаць салдата, яго шапка зімоўка, даўжэзная шынель, чабаты—цямнеюць вот на снезе—усё нагадвае дзівасную начную птаху.

Другі—меншы. Кароткая шынелька яго з абвіслым хлясцікам рабіла яго незвычайна шырокім, цельпухаватым. Але быў ён наўздзіў рухавы, як ветраковыя тыя махі круціліся рукі яго і сам ён усё подбежкам, подбежкам, каб наперад заскочыць, каб слова сваё перад людзьмі паказаць, не толькі што выказаць. Ён торапка гаварыў, каўтаў цэлыя словы і, відаць, хацелася-ж чалавеку як мага больш выгаварыцца, расказаць пра тыя дзівы дзіўныя, дзе й сам ён быў, што й сам ён бачыў. Аж засопся, запарыўся:

— ... дык мы, братачка, й далі... Ну, й далі... Яны ў атаку, мы на штыхі... Пад самымі Баранавічамі... пятнаццаць раз адбіваліся, ну а потым гэта мы націснулі... Бы-ы-ло... Як хмара тая цёмная, градавая—так лягло на тым полі германцаў...

— Ну-у...—ні то сумняваючыся, ні то здзіўляючыся мармытнулі пад нос рудыя вусы.

— Бы-ы-ло... чацвера сутак узапар палілі мы іх, у штабялёх такіх палілі... Крыві гэ-э-та... так і шваркоча...

— Як на патэльні, кажаш...—усміхнуўся тут высокі і раптам абрэзаў:—Ці не кашаварам ты быў на этапным пункце, мой голуб?

— Як гэта так?—аж сцяліся плечы ў меншага, у шырокага. Ад крыўды хіба, ад нечаканасці.—Як гэта так?—пытаю. К чаму гэта ты?

— А к таму вот, ваяка мой кашаварны, што фронта, відаць, ты не бачыў і пораха таго нюхаць табе не даводзілася... Хто гэта з нас ды такімі справамі пахвалящца будзе... Дзе ты бачыў... Ну, ваявалі, ну, біліся... І нічога тут, браце мой, дзіўнага. Проста вот так і памераць даводзілася, без слова твайго ды прыгожага, выкручастага... Проста вот так і памірали людзі, хіба нялюдскі крыху. І без ніякіх там хмар градавых... клаліся, дзе каму собіла. А кроў? Кроў, браце мой, яна не шваркоча... Яна можа і ціханька сыйсці і няўпрыцям табе, а яна і пашпа і пашла і душу тваю павяла з сабой... Зямля, браце мой, мякая зямля, для крыві тваёй лягчэй яна пуха і ўсё ў сябе ўбярэ, а ні звання, ні расіначкі. А ты—шварко-о-ча... цёмныя хма-а-ры... Шваркатун, ты, можна сказаць, не ваяка, а атопак салдацкі... Вось што я табе скажу... І годзе, даволі мне твае глупствы слухаць, скажы лепш, як ты бруха расціў... Бач, ражка ў цябе, як азадак той панскі... Аб такую ражку і куля любая пасароміцца апаганіцца... А ты кажаш, на штыхі...

— Ды што ты, чалавеча, ды на табе крыж часны... Калі я маю... Вот-жа я... Калі хочаш, і чобат зніму...—і, кінуўшы шапку вобзем, намерыўся чалавеча чабаты зняць. — Вот рана ў мяне, вялікая, значыцца рана...—але асаблівага спрыту з чабатом усё-ж не выказваў.

— *Ты гэта кінь... Бачу, як на ране сваёй гоцаеш... Не грэба* вот хваліцца, дружа... Салдат ты й салдат, чалавек *самы* шэры. А ты—ра-а-ны, хмары тыя градавыя...

Нешта хацеў яшчэ меншы сварыцца, мяліўся нешта сказаць, але *безнадзейна махнуў рукой, шапку насунуў* на самыя вушы і шоў утароплены, збіваючыся з салдацкага кроку. Шоў і маўчаў, але відаць, быў ён з людзей гаманлівых і было тое маўчанне яму за пакуту і за вялікую крыўду. Усё сапеў пад нос, *круціў цыгарку, і цыгарка тая не давалася на марозе*—ірвалася папера, былі неўвароткія пальцы тыя, адубелыя, азызлыя. І ўжо ля самага горада, заўважыўшы Васіля Панфілавіча і яго акуляры, узяў нясцерп чалавека, запытаў:

— *З навукі хіба йдзіцё?*

Каб загаманіць, значыцца.

— Чаму з навукі?

— А вот акуляры ў вас, адразу відаць чалавека вучонага... У нас, у хазяйсцвеннай камандзе...—вот чорт цягне за языка.— Дык ці не знойдзецца ў вас, землячок, папіросіны якой для франтавога салдаціка?—і азірнуўся з апаскай на таго высокага і маўкліваго.

Той шоў і не адзываўся. Курыў, рэзкія ўзмахі рук з цыгаркай кідалі іскры махоркі, матлялася шынель, хвастала па чаботах, махорачны дым воблакамі віўся ля шапкі і ніяк не мог растануць у густым марозным паветры. Чалавек шоў і крок яго быў роўным, адмерным, верным, як тыя хвіліны, чоткім, упэўненым.

— Сіла пад ім, пад чалавекам гэтым...—падумалася Васілю Панфілавічу. І як часта здаралася—стала шкада сябе... Вось ён ходзіць, ён, Васіль Панфілавіч, па зямлі і няма таго кроку, няма тых узмахаў рук, няма і таго, каб вот разам так, налапам, чалавеку ў вочы—і атопак ты... ражка твая... Гэта ў твар чалавеку. Ходзіць ён па зямлі, ён, Васіль Панфілавіч,—і нідзе нага тая цвёрда не ступіць—усё з аглядкаю. На сябе, на другіх, усё найбольш на імёны вялікія, на былыя гады, на былыя вялікія справы. А свае вот, людскія вот—і вялікія і малыя—не па-людску выходзяць усе справы гэтыя, нешта сэрца не хіліць да іх. Шэрыя справы, шэрыя дні, шэрыя людзі. І каб толькі шэрыя. Чорныя дні спасцігнулі зямлю, спасцігнулі краіну. І ходзім вот, ходзім блядымі ценьмі. Ні прытулку, ні радасці, ні зачэпкі зноў цвёрдай, каб трымацца за жыццё ды абедзвюма рукамі, сашчарэпіўшы іх, ды так, каб зубы трышчэлі.

Ды каб ясныя мэты былі.

І не мэты. Ясныя яны. Вось веры тае не стае. Рукі віснуць. На што-ж абаперціся?

... Калі падыходзілі да гарадка, было светла зусім, сям-там старожкая цішыня вуліц парушалася скрыпам квортак—шлі людзі на працу. Спазаранку праяжджалі на базар сяляне, былі казачныя коні ў іх, атуленыя, марозным інеем. Рыпелі сані і рыпагой быў бадзёры такі, вясёлы.

Разышліся спадарожнікі хто куды, і Васіль Панфілавіч так і забыўся запытацца, хто яны, скуль яны, у каго якія справы ды клопаты.

Надыходзіў дзень, а з ім надыходзілі і шэрыя будзённашныя клопаты. Зайсці ў заежджы дом які, напаткаць спадарожнікаў, фурмана напытаць. Каб дамоў, да роднае хаты. Колькі то год тых не бачыліся...

2

> „І паядоша сем кравы злыя і худыя целесы сем краў добрых відам і ізбраных целесы (і сія невідзіма быша, яко внідоша ў чрэсла іх)..."

— Дзя-я-лы...—пачухаў патыліцу Лаўрэн.—Дзе гэта відана, каб худыя ды гладкага. У нас дык яно наадварот, гладкія куды спрытней... Узяць Цыбала, скажам, ці Хвядоса старасту. Праглынаюць худзейшых. Адным вобмегам праглынаюць. І чрэслы ніштo, ушыркі разыходзяцца як ні лопнуць, хоць ты засекі проса засыпай у тыя чрэслы.

Любіў Лаўрэн вольным часам кніжку якую пачытаць. Налягаў усё на божае слова. За гэтае слова і старастам яго ў свой час зрабілі. Быў ён чалавек ціхі, не языкаваты, дрэннага слова ад яго не пачуеш. Жыў з сям'ёй з невялічкае гаспадаркі, сякітакі прыбытак меў ад Дняпра і з параходства ды за пожні тыя сяльчанскія, вартаваў што начамі. І калі зрабіўся старастам, дужа-ж уцеха была вялікая. Стаіш вот, свечы прадаеш, і кожны тут да цябе: «З днём святым вас, пане-Лаўрэн...» Стаіш, пітнуешся, каб не спазніцца ў алтар зайсці, свячу там выпосіць, ладану паткласці. Увесь народ на цябе глядзіць, а ты гэта проста ў алтар, дзе толькі-ж тыя духоўныя асобы і ходзяць. Духоўныя асобы і ты разам з імі. А тут свечы гараць, пах *той ідзе духавіты, урачыста пабліскваюць мядзяныя ўборы свя*тых, калышуцца пратасэі. Тут табе поп у светлых рызах выходзіць, чашу нясе І голас як з неба:

— Піце кроў маю, сія бо ёсць кроў новага завета, якая за вы і за многіх ізліваемая...

Та-а-к... Кроў праліваць...

Але кроў крывёй. Можа яна, канешне, і кроў для другіх, каторыя гэта не ведаюць. Лаўрэн-жа ведае. На кроў тую, на тое прычасце святое самае каліва якое патрэбна, самае большае—невялікую чарачку. А тут што пядзеля, нясі пляшку цэлую. А разыйдзецца айцец Панфіл, калі войдзе ў ахвоту, у смак—і дзве цягні, і то яму мала. Спрабаваў Лаўрэн па прастаце сваёй душэўнай намякнуць яму.

— Трохі гэта, бацюшка, і залішне-б, здаецца, на святое прычасце аж паўгарца браць... Ізноў-жа наклад царкве, непамерны, можна сказаць, выдатак...

Дык дзе там.

— Эх, Лаўрэн, Лаўрэн, абуялі цябе думкі непатрэбныя, грэшныя... А чашу паласкаць, трэба? Трэба. Што-ж ты яе грэшнай вадой паласкаць будзеш, хрыстову кроў варам сквярніць?

Хіба то паласкаць...

І старанна паласкаў поп. Так набгом і палошчыць, вобмегам і асушыць: і чашу і пляшкі тыя.

Не у пляшках, канешне, справа. Не імі свет стаіць, не імі тая праўда трымаецца. А ўрэшце, скуль ідзе гэтая праўда і хто ў ёй віднеі: бог ці людзі? Хіба для гэтай праўды ўкінуўся поп у камерцыю, хіба для гэтай праўды трэба яму, Лаўрэну, учашчаць у горад, ды не за свячамі тымі васковымі, не віном царкоўным, а ідзі ты вот, ды пра нафту пытай, нафту закупай для млына. Зусім гэтая справа не да бога.

І доўгімі зімнімі вечарамі, альбо летнімі начамі на Дняпры думае часам стары пра бога, пра вышэйшую тую праўду і ўсё ніяк не знаходзіць парадку. Спрабаваў прыглядацца да людзей, што другое веры, як гэта ў іх, якое адрозненне, праўды ўсё тае шукаў, божацкае і чалавецкае. З-за гэтае праўды і непрыемнасці якія-такія займеў. Не так даўно, па восені, ездзіў да знаёмага бандара ў вёску Здырдзічы—века вот ад хлебніцы зусім пайчапалася, патрэбна было новае. Але не аб адным там веку клопат быў, захацелася бліжэй паглядзець, як гэтыя здырдзічане жывуць. Пабыў у хатах некалькіх, падзівіўся на паперыны белыя, на якіх літарамі друкаванымі божыя словы напісаны. І паперы заместа абразоў па сценах вісяць. І ўсё добрыя словы: і аб шчацэ, і аб апошняй сарочцы, аб бліжніх тых... Дужа ўсцешыўся было духам, вот-жа людзі жывуць, праўду блюдуць, праўда тая са сцяны проста ў вочы просіцца. А как паехаў было дахаты і ўсю вёску праехаў, схапіўся раптам за голаў, на колы зірнуўшы. Былі гэта шыны на іх, на ўсім панарадзе, тоўстыя такія шыны, хазяйскія, спецыяльна шчэ ў горадзе купляў, выбіраў колькі. Яшчэ мала ўжываныя, можна сказаць. Месяцы два як нацягнуў іх толькі каваль Іван Іванавіч. І добра так нацягнуў, у самы сухмень як уліплыя, ні шчылінкі табе, ні бразгоцінкі. І на табе. Былі шыны, вот толькі былі

і не стала іх, не стала тых шынаў важных. Як кот злізаў. Вылаяўся на чым свет ды назад, да евангельскіх тых хрысціян.

— Як-жа гэта, кажа, ды каб шыны, браццы, цягаць... Ды ў самы-ж дзень, у свята, можна сказаць, чалавека абязножваць... Дзіва то, калёсы без шынаў, адна відзімасць цяпер, рассыпацца ім цяпер—адно—плюнуць.

— А ты, чалавеча, і плюнь... Ты, брат ва хрысце, не зважай... Мірскія то справы шыны, і не на шынах тых, браце, да бога ехаць...

І дзіва што ціхі чалавек Лаўрэн, і мухі тае здарма не пакрыўдзіць, а тут нясцерп узяў.

— Падавіцеся, кажа, сукіны вы сыны, шынамі тымі! Каб за тымі вы шынамі бога не бачылі, сулластаты!..

Дужа іх укрыўдуеш... Узялі, гады, шыны і насміхаюцца яшчэ.

— Ты, чалавеча, не сярдуй... Вёска у нас такая, голуб, што і у лапці можа абуць цябе... Зусім гэта простая справа... Шукаць, кажаш?.. Дзе ты іх, чалавеча, знойдзеш, калі яны, быць можа, ужо трэцім разам перакрадзены... Едзь ты, чалавеча, дахаты : сябе не ўводзь у клопаты лішнія.

І паехаў. Такі адведаў евангельскіх тых хрысціян, праўду тую, можна сказаць. Нават нікому не сказаў пра свае прыгоды.

А вёска Здырдзічы сапраўды славілася на ўсёй акрузе. Дзе *ні ярмалак, ці проста базар які, не абыходзілася без здырдаўшаў.* Усёй, бадай, вёскай кралі, кумпаніямі цэлымі. Адны на самапрадкі спецы, другія па частцы ботаў—дужа ужо задоўга прымяралі. Пакуль прымервае адзін, глядзіш, пара-другая чабатоў і паехала. Трэція на жыўнасць спрыт мелі, каб барана там сперці, цялё якое. Проста на вачах бралі, ды так бралі, што і не прычэпішся. Не грэбавалі і драбязой: і лыжкай там асінавай, стаканам семэк, шапкай дзяцінаю.

Былі і буйныя спецы, вялікія аматары крадзёжнай справы, аб якіх гаварылі з зайздрасцю, з замілаваннем. Хіба вот валоўя справа. Пачалі гэта летам на чыгункі валы прападаць. З цягнікоў, што на фронт, для салдатаў. І не дзе-небудзь на супынку, на станцыі, а прападаюць валы ў дарозе, на перагоне, па начах прападаюць. Проста, як растаюць, ні рог тых ад іх, а ні скуры, былі валы і нямашака. Ледзь, ледзь угледзелі, прысачылі. То-ж было турбацый здырдаўцам, адных вобыскаў колькі. Праўда,

валоў так і не знайшлі, зніклі валы назаўсёды. А лоўка бралі іх з вагонаў. Пакрэхтвае цягнік на горку, тут і ў вагон можна спрытна забрацца. А другі ля вагона з вяроўкамі, каб за ногі вала ўшчапіць, кэб як лузнецца з вагона вол, хутчэй яго ў бок, каб пад колы не трапіў. А тут і ў лапці. Абуюць вала і сляда нямашака. І колькі пакралі. Адны крадуць, другія перакрадаюць. Пакуль валу рачанцы выйдуць, дык ён у хлявах у трох пабывае. Але-ж валовыя справы прыціхлі. Дазналіся, сталі спецыяльна сачыць, на перагоне і спаймалі некаторых.

Вот табе і евангельскія хрысціяне, каторыя па пісанію жывуць. Хто іх, канешне, разбярэ, і якая прычына крадзяжу іхнаму, ніхто не ведае. Не ад салодкага, мусіць, жыцця. Баялі старыя людзі, шібы за даўнымі часамі, калі воля была прышла, пасадзілі гэтых здырдаўцаў проста так на пясок, на голы пясок. Яно, канешне, і красці пачнеш, на жоўты пясок сеўшы. І трэба сказаць, каб занадта людзі гневаліся на здырдаўцаў, дык не. Прывыклі ўжо. Другога злодзея пападуць, дык мяса тое на ім да жывое касці знімуць. Вун старавера аднаго, канакрада. Той таксама быў госпада бога прыплёў, калі пачалі яму рэбры лушчыць.

— За госпада, кажа, пакуту прымаю.

Тут усыпалі яшчэ болей. На што ціхі чалавек Лаўрэн, і то не сцярпеў:

— Не за госпада, сукін сын, а за сівую кабылу пакутуеш!...

І пра шыны свае ўзгадаў тады.

Дык вось вам і праўда. Разбярыся ў ёй, разблытай. І Лаўрэн усё шукае праўды, з разумнымі людзьмі не прамінае словам якім перакінуцца, чытае кніжкі вольным часам. Усё тое божае слова. Чытае ўголас, жонка слухае. Не зусім, каб ёй да спадобы быў занятак гэты: і час чалавек дарма марнуе, і зноў-жа й газа як агнём смыліць. Але слухала. Да слоў тых прыслухалася, ды на лад на свой перастаўляла.

«... і взя камень, егоже положи тамо в возглавие себе: и постави его в столи, и возлия елей верху его...»

— Ты-б і сапраўды, Лаўрэн, алею ў Еўніхі ўзяў, на самым дне, бадай, засталося ў баклажцы...

— Ціху ты... Алей табе раптам прыспічыў... «Востаў-жа Іакаў, взя жоны свая і дзеці свая на вярблюды...»

— А каровы, Лаўрэнка, не поены... Табе ўсё вярблюды на ўме...

— Хіба-ж то адчапілася-б ты, назола, не даеш божага слова чытаць...

— Мне з гэтага слова карысць невялікая. Кароў вот напой, тады й чытай... Вялікі то клопат мне...

— Яно, канешне, табе не вялікі, дужа ты разумееш у пісанні, што яно і да чаго.

— Сказаць, каб тое пісанне табе розуму дадало, дык не скажаш... Сыны вун басякамі растуць...

— Ніхто як бог...

— І твая дурасць...

— Ну, ты ўжо там, цішэй хаця крыху.

Але каровы паіць шоў.

3

Калі-б не гэтая дзяўчына, дык зусім было-б сумна ў заежджым доме, з забруджанымі шэрымі сценамі, з шурпатай сукаватай падлогай, з прусамі, з прэлым пахам мокрых аўчын і зляжалага хлеба. Ды яшчэ цыбулі і тараноў, на якія заўзята насядалі гаманлівыя балаголы, насядалі з такім апетытам, ламалі такія акрайцы хлеба, што, здаецца, мёртваму захацелася-б есці, зірнуўшы на гэтыя напружаныя, чырвоныя сківіцы, на пагражаючы бляск зубоў.

Балаголы елі і не забываліся аб сваіх справах, не праміналі ніводнага чалавека, які заходзіў у пакой і аглядалі яго таропкім крытычным вокам: а ці не пасажыр то, а ці мае багаж, ці так сам-па-сабе і ці будзе з яго якая камерцыя. Яны аглядалі, лаяліся між сабою, спрачаліся і ўся гэта гаворка іхная была незразумела Васілю Панфілавічу. Таму было-б зусім сумна, каб не гэтая дзяўчына. Яна сядзела на лаве побач з рознымі клункамі і карзінай. Тут-жа ахапак кніжок, перавязаных раменчыкам, ды ў руках дзяўчыны нейкі невялічкі томік.

«Відаць, Ляскоў, ці Памялоўскі», падумаў Васіль Панфілавіч. «Такія вот да «Нівы» дадаткамі».

І яшчэ:

«Відаць, адна з тых дзяўчын, якіх местачковыя бацькі пасылаюць у навуку на апошнія медзякі. За шчасцем пасылаюць. Каб вывесці ў людзі».

Васіль Панфілавіч пазіраў зрэдку на гэту дзяўчыну, на не сарамлівы твар з такімі задуменнымі вачыма, смуглым лобам, на які панавіслі непадаткія да грэбня чарнявыя кудзеркі.

Дзяўчына адчувала сябе ніякавата, не магла схаваць гэтай здрадлівай чырвані, якая расплывалася па твары, калі знячэўку сустракаліся вочы. І тады запытаў Васіль Панфілавіч:

— Вучышся?

— Так, вучуся...

— У гімназіі?

— Так, у мясцовай...

Дзяўчына старанна ўшылася ў кніжку і Васіль Панфілавіч не знайшоў патрэбным распытваць далей. А тут і новыя людзі зашлі у пакой. Адзін з іх падышоў да дзяўчыны, ласкава ўзяў яе за плечы.

— Ну, як, прачакалася мусіць? А мы і паедзем хутка дахаты, забавіўся я крыху па справах. Дык ты ўжо сабірайся.

І ўжо да людзей, да пасажыраў, да балаголаў знаёмых:

— А гэта дачка мая, Бэрта. У горадзе тут жыве, вучыцца, у самага Біндэра на кватэры...

— Што вы кажаце, рэб Нохім, гэта-ж такое дзіця,—хвалілі бацьку за дачку, за добрыя справы.

— Та-а-к... У самага Біндэра, два магазіны ў яго...

— Што вы гаворыце? Шанцуе вам, рэб Нохім.

— У чым шанцуе?

— Па-першае, дачка... Па-другое, на кватэры ў такім паважным доме... Па-трэцяе, вязець вам ва ўсім, рэб Нохім... Каму цяпер проста канцы прышлі, а вы з сваім малаком ні на што не шманаеце.

— Ага... Малако ўсім патрэбна і каровы, слава богу, забастовак не ладзяць.

Гэта была ўжо вышэйшая палітыка, паказ таго, што ён, рэб Нохім, не лапцем кроены і ў сім-тым разбіраецца. Таму і паважна агледзеўся ён навакол, каб паказаць усім добрым людзям, які ён спрытны, які ён дасціпны на ўсё. І калі заўважыў акуляры Васіля Панфілавіча, крыху сцяўся.

— То-ж дурны я, пры чужым чалавеку ляпаю языком аб усім.

Але хутка супакоіўся і пачаў пільней прыглядацца да гэтага чалавека ў акулярах. Было ў ім нешта знаёмае. Ці калісьці

бачыў, ці сустракаўся нават. І прашоўшыся колькі раз па пакою, рэб Нохім зусім падышоў да чалавека, загаварыў з ім.

— Дык дзень вам добры... Ці не бацюшку вы, айцу Панфілу, сынам даводзіцеся?

— Бадай, што так... А скуль вы мяне ведаеце?

— *Да я-ж з таго самага мястэчка, дзе й жыве айцец ваш. Ці* не дахаты едзеце?

— А куды-ж болей?

— Та-а-к...—і ў голасе рэб Нохіма чулася ўжо расчараванне. Трэба-ж было распачынаць гаворку, то-ж натура. Ды з чалавекам такім, які сасланы быў. А можа чалавек уцёк? А можа чалавек сапраўды злачынец? Але, як-ні-як, бацькам яму поп даводзіцца і даволі такі цікавы поп, камерцыйны чалавек, разумны. Ведае, дзе што ляжыць. Ізноў-жа і карысны часам чалавек. Калі, скажам, грошы там ці што. Можна чалавеку і прыемнае што-небудзь зрабіць.

— Дык вы можа-б са мной і паехалі, усё-ж у мяне на возе вальней, чым у балаголаў...

— А чаму-б мне з вамі і не паехаць...—і быў той адказ *просты, звычайны. Да таго звычайны, што рэб Нохім як у пельку* ўпаў, у халодную. Каб з ссыльным чалавекам, ды на адным возе, ды яшчэ на сваім уласным возе. Але-ж, ізноў-ткі, прыемнасць папу будзе, калі-ні-калі ўзгадае чалавек аб рэб Нохіму, не шкодзіць мець зачэпкі лішнія ў жыцці.

Рэб Нохім прашоўся колькі раз па пакою і да дачкі прысеў, на вуха ціханька:

— Гэта-ж папа нашага сын, у ссылцы быў...—і пра сябе падумаў ізноў: «чорт-жа мяне за язык цягне... Як пачнецца дзень дуратою, дык чаго не наробіш толькі. Трэба вот дзіцё палохаць...»

І калі селі на воз, рэб Нохім быў ужо зусім нездаволены. «Гэта-ж трэба,—думалася,—такія дурасці рабіць. І каму? Мне, каторага ўсе паважаюць, як за разумнага чалавека. Дык на старасці год ён захацеў, каб па прыставах цягалі. Ізноў-жа і чалавек: яго з далікатнасці закрані, а ён ужо і да воза прэцца...»

Але чым далей ад'яжджалі ад горада, настрой рэб Нохіма рабіўся лепшым і ён гатоў быў нават распачаць гутарку. Аб вайне, аб цяжкіх гадах, «чым гэта ўсё скончыцца...», пра дачку і т. д. Ён нават павярнуўся да Васіля Панфілавіча:

— Вось дачка ў мяне... Каторы то год сам гадую...

Хацеў яшчэ аб жыцці сказаць слова, другое, але сустрэўся позіркам з Бэрцінымі вачыма і без слоў зразумеў, як не хоча яна, каб ён гаварыў аб ёй, аб яе справах, аб яе жыцці. Зразумеў і змоўк, нукнуўшы для прыліку на каня.

— Ты ў мяне на дысцыпліну забыўся, ідзеш, як гаршкі вязеш... Вот агрэю пугай...

Бэрта сапраўды адчувала сябе ніякавата. Ёй не падабаліся бацькавы паводзіны, яго заўсёдашнае жаданне прыслужыць каму, угадзіць, калі трэба, а то і не трэба. Ёй не падабалася бацькава пахвальба аб яе кватэры ў багатых людзей. Не падабаўся ліслівы тон бацькавых слоў перад самім Біндэрам. Вечна гэтыя ўпросы, слязлівыя просьбы: «Вы ўжо не забывайце на беднага яўрэя, на каго беднаму яўрэю і спадзявацца, як не на вас...» І зачым так ніціцца чалавеку, зневажаць сябе. Не такі ўжо і бедны чалавек. І кватэру-б можна другую. Дык не, абавязкова ў багатых, абавязкова ў вядомых, каб потым выхваляцца перад сваімі, перад местачкоўцамі.

Не так ужо ёй і добра ў Біндэра. Не так ужо і прыемна ў іх на кватэры, дзе адчуваеш сябе, як чужая, дзе сядзіш за сталом часам як на вуголлях, дзе глядзяць на цябе, як на бедную сірату. Свет-жа такі нямілы тады.

Але ці не праз гэтыя слязлівыя просьбы бацькавы трапіла яна ў гімназію? І цяжка разабрацца тут у сваіх думках пра бацьку: ці дзякаваць яго, ці крыўдаваць. Успаміны пра паступленне ў гімназію вярэдзяць душу. З імі прыходзяць незлічоныя крыўды, якія ніколі не забываюцца. Раней—«якая маленькая жыдовачка», пазней—«прыгожая жыдовачка», «шкада, што жыдовачка». Цяпер то ніхто гэтага ў вочы не скажа. Бэрце шаснаццаты год.

Праўда, шмат цяпер новых крыўд, крыўд куды больш балючых. Не сваіх асабістых. І цяжка іх, крыўды гэтыя, пагадзіць з жыццём, пагадзіць з яго віратлівым разбегам, з кіпучай пярэстасцю яго дзён. Жыццё ідзе, такое прывабнае і прыгожае, такое заклікаючае сваімі нязведанымі яшчэ тайнамі, сваёй чаруючай свежасцю і непазнанасцю.

І такое цяжкае часам, чорнае як ноч, як туга, як безнадзейная глухая роспач. Гэта пачалося з таго часу, калі ўвесь свет стаў дваіцца перад Бэрцінымі вачмі, распадацца на дзве вялікія

часткі, і часткі тыя былі варожыя адна другой. І што шчэ цяжэй—у кожнае частцы было сваё прыемнае, прыцягваючае, за што можна было аддаць свае сілы, чаму аддаваліся найлепшыя думкі і парыванні. Былі ў першай частцы і бязмежны Пушкін і вялікі Талстой, лермантаўская пячаль, ясныя, як сонечны дзень, тургенеўскія дзяўчыны, была дзівосная і хмялявая мудрасць горкаўскіх басякоў, чаруючая цяплынь гогалеўскіх казак, гаркаватая слодыч чэхаўскіх слоў. І за ўсім гэтым уставалі гэтыя палохаючыя і грозныя словы: айчына, вялікая руская зямля, імператарская дзяржава. І за дзяржавай, тулячыся за бліскучыя мундзіры, за вайсковую шчаціну штыхоў, за чорныя і залатыя рызы святых сатрапаў шлі Пурышкевічы, Маркавы, шлі шматлікія атрады Чабырачак, шлі, і ў позірках іх была крывавая муць, і на вуснах у іх былі брудныя і крывавыя словы. І яны гаварылі аб бацькаўшчыне, аб вялікай зямлі рускай, аб спрадвечных і непарушных святынях, аб веры, цару і айчыне. І чуючы гэтыя словы, было цяжка і крыўдна за іх, за вялікіх: за Талстога, за Пушкіна..., за светлыя імёны Чарнышэўскага, Міхайлоўскага, за дзесяткі і сотні імён, якія зніклі, растанулі ў крывавым тумане перад гэтай няўмольнай шчаціной штыхоў, перад палаючым бляскам кароны. Часам, каб адыйсці ад балючага, апякаючага, прабавала «ключы шчасця», зачытвалася поўнымі цынізма і чалавечай подласці арцыбашаўскімі радкамі. Было прыкра, гідліва, але чытала да канца, каб пазнаць чалавечую праўду ва ўсіх яе праяўленнях, ва ўсіх рознастайных крыніцах, і светлых і цёмных.

І была другая частка. Тут былі змрочныя вуліцы, пярэстая ўбогасць базараў, прыплюснутыя да зямлі халупы, вясёлкавы ад старасці блеск акон у сінагоге. І больш за ўсё ўбогіх лахманоў, з якіх выглядалі на свет божы задуменныя вочы. І часта слязіліся гэтыя вочы, палымелі чырванню трахомы. Ды зеляніліся твары цвіллю сутарэнняў і пакорлівай беднасці. Тут былі свае радасці, свае святы. І больш за ўсё гора.

О родина!..
Ты много сил дала,—по капле, как змея,
Их высосала скорбь и горе роковое.

Так. Тут была свая радзіма. Аб ёй гаварыў Шолам Алэйхем, ёй складалі гімны паэты. І салодкай атрутай здаваліся радкі Бя-

ліка, Фруга. Пасля іх кружылася галава, віхрыліся ўзнёслы думкі, але ападалі яны хутка ў халодным бяссіллі, згасалі ў за чараваным коле суровых дзён і год, нібы скавана была спрадвеч нымі ланцугамі чалавечая воля і людскія жаданні. Паэты пе аб радзіме, але песні тыя былі хутчэй надмагільнымі песням чалавечым надзеям і радасцям. Радзіма была. І не было яе. Гэт слова лунала, як замшэлыя паданні, яно свяцілася, як слабы агонькі светачаў Макавеевых. Аб радзіме гаварылі па рознам Адны бачылі яе на прывольным улонні Дняпра, другія—ў далі кай Палесціне, трэція—у агульнарасійскай радзіме. І цяжка был апазнаць яе светлыя рысы, улавіць яе прасторы, яе І ко' праў быў вялікі геній Байрон, які бачыў у магіл радзіму старога беспрытульнага народа.

Аб якой-жа радзіме думаць тады?

... Конь ішоў паволі. Гаварыў з нейкімі людзьмі ба дзеў, насупіўшыся, гэты чалавек у акулярах. Чалавек цёр но відаць, яму было холадна. І ўвесь гэты чалавек, нягеглы так хударлявы, калючая барада настырчылася шчаціной, цмяна па бліскваюць над вачмі запацелыя шкельцы. Часам бярэ чалаве гэтыя шкельцы і прыжмурыўшы вочы, працірае іх хусцінка Чалавеку холадна, ён зябка паціпае плячмі, разнімае нагу і тады сабіраюцца маршчакі на ілбе і чалавек праводзіц па іх стомленым рукі рукі, нібы змесці іх хоча, сабраць жменю ды кінуць вот так на дарозе, на жыццёвы той узве вецер.

«Ссыльны...»—прыходзяць на памяць бацькавы словы. І тад хочацца Бэці разгадаць гэтага чалавека, увайсці ў яг сукрытыя думкі і ў яго жыццё. Яно-ж такое няведамае і нябачанае.

«Рускі...»—абрываецца думка дзесьці і вот, вот згаснуць в сэрцы іскаркі цяплыні. Цяплыні да чалавека, да зябкіх плеч яг да яго маршчакоў шматлікіх.

«Але-ж ён не з тымі... Ён супроць тых... Ён адтуль, адкул ілве вялікая чалавечая праўда...»

— Вы от павярніцеся так... Так-жа лепей, цяпжей...—пр казала да яго. Праказала так проста, так звычайна.

— Дзякую...—адказаў чалавек. І ў адказе тым была с праўдная глыбокая шчырасць.

4

Калі пад'ехаў Банадысь да стажка, нешта кінуліся коні ў бок, зашасталі палахліва вушмі.

«Мо' воўк дзе ў парасніку ўшыўся...»—мільганула думка ў Банадыся. Ён прывязаў коні, аглядзеўся. На замерзлым балацянішчы грудзіліся шматлікія стагі сена, некаторыя былі ўжо звезены, і на месцы іх чарнелі незацярушаныя снегам сцяжарні.

«Дабра вот, дабра панакашвалі людзі... А нашага бадай болей... Прыдзе вясна, колькі тады грошай траціць у кішэню. Праўда, у бацькаву. Але-ж пры такім дзеле сёе-тое і мне можа перападзе... То-ж гуляй тады з дзеўкамі, раскошуй з салдаткамі...»

Калі падышоў да стога, каб абраць зручнейшае месца, дзе браць сена, крыху здзівіўся. Збоку ляжала свежа нацярушанае сена, стог быў ускудлачаны крыху знізу і ярка зеляніўся пад халодным зімнім сонцам гэты раскудлачаны бок.

«Які бо то чорт бязульствам займаўся?..»

Прыгнуўся, каб разгледзець сляды поблізу. На шурпатым лёдзе відаць былі белыя меціны, як ад падковак, ды на снежным сувойчыку ля куста быў ён, след, поўны, на ўсю нагу, на ўвесь поўны чобат.

«Каго тут прымха якая насіла?»

І калі ўважліва прыгледзеўся следа, раптам асеў, аж пасклізнуўся на лёдзе і ледзь, ледзь не выскачыла з грудзей тое сэрца ад страху. Чуў Банадысь, як кашлянуў нехта, самым такім звычайным чалавечым кашлем. Напалохана аглядзеўся навокал. Нідзе ні душы. Стаяць, не варухнуцца аснежаныя стагі, да болю пабліскваe лёд на сонцы, старая алешына не варухне ні галінкай, ні застаўшымся ліcцейкам—стаіць скутая белым інеем, у марозных блёстках якога пераліваецца вясёлкавымі агнямі сонца.

«Што за чамярыца, ці не стрызнілася?»

Але калі зноў падышоў да стога і намерыўся быў раскрываць яго бок, дык бадай што самлеў, скамянеўшы на месцы. З разварушанага сена відаць былі ногі, абутыя ў звычайныя салдацкія чабаты—'шчэ падкоўкі тыя не сцёрліся на іх. Ды самы звычайны храп чуваць быў адтуль са стога. Відаць, залез чалавек, ушыўся ў сяродку і спаў сабе соладка, пасвіставочы на ўсе насавыя застаўкі.

Халодны жах апавіў Банадыся.

— Няйначай Бартох Антон. Ён-жа хаваецца цяпер, уцёкшы з астрога, паранены... Ён то на мяне вока мае, ведае, хто даказчыкам быў, калі лавілі ў гумне, нябось людзі даўно давялі.

Банадысь кінуўся да коняй і, не спускаючы воч з чабатоў тых, торапка хапаўся рукамі за зашмаргу тую ад лейцаў. Адубелыя пальцы—кінуў са страху сподкі ля стога—ніяк не маглі справіцца з непадатнаю зашмаргай, і калі заўважыў Банадысь, як наварушыліся тыя чабаты, ды зноў кашляпуў той, у сене, тады кінуў і коні, і сані, і бегма кінуўся праз усё балацяніпіча, праз кусты і праз алешкавы параснік, каб хутчэй прасцяком на дарогу. Бег і не азіраўся назад. Баяўся заўважыць услед за сабою грозную постаць ворага. «Калі Антон—заб'е, калі й другі які дызертыр—таксама не чакай дабра. Яны цяпер злыя, як гады, як восы тыя, калі ты іх кіем зачэпіш, разварушыш гняздоўе іхнае, асінае...»

І толькі тады суцішыўся, кінуў бегчы, калі мінуў лес і вышаў на поле, якое межавала з мястэчкам. Тут ужо не страшна. Тут і дахаты блізка, і да ўрадніка недалёка... І чым бліжэй да хаты, тым смялейшым рабіўся Банадысь і, калі ўваходзіў у мястэчка, нават жалкаваць стаў, чаму гэта ён, Банадысь, ды не звязаў гэтага самага чалавека, чые ногі тырчаць са стога.

— Гэта-ж такі выпадак зручны: узяў лейцы ды звязаў яго сончага, як цялё... Проста вот да ўрадніка і прывёз бы, сказаў-бы яму: на вот, злачынцу спаймаў, голымі рукамі, можна сказаць, узяў... Гутарак-бы колькі адных... І зноў-жа, дзеўкі... Зусім іншы тады разгавор з імі... Цяпер каторая і папікне часам: смеласці ў цябе, Банадысь, не хапае, а ўсё таму, што ў салдатах ты, мусіць, не быў. Толькі-ж на нас і смелы ты... Т-а-ак... трэба было звязаць гада без усякага ўсякага... Але, зноў-ткі, папрабуй ты яго звязаць каторага. Мо' каму жызня абрыдзела, толькі не мне... Няхай другія вяжуць... Ну й клопату нарабіў-жа...

Банадысь зашоў дахаты, каб бацьку аб усім расказаць і зараз-жа выправіць яго з людзьмі да стагоў. Не застаўшы бацьку дома, пашоў да ўрадніка.

Той сядзеў за сталом. Абвіслыя вусы здаваліся яшчэ дзёжэй. На іх наліплі калівы капусты, якая стаяла на стале ў вялікай місе побач з пачатай пляшкай гарэлкі, з акрайчыкам хлеба ды парай-другой гуркоў... Былі тыя гуркі кіслыя, салёныя—аж прыжмур-

заў вока ўраднік ад вялікае асалоды—ад агурковага соку, ад паху таго тміннага, духавітага.

— Гуркі ў цябе, жана, нішто, важнецкія, можна сказаць, гуркі, у поўнай спраўнасці, павінен я сказаць, і акуратнасці. Царскія гуркі, што і казаць. Але што да палітыкі, дык ты, жана, не сунься, гэта, жана, не твая кампетэнцыя, як кажа сам пан прыстаў. Гэта ўжо мая кампетэнцыя, і павінен я тут поўнае сваё разуменне мець і захады прымаць, бо тут палітыка, тут факт, можна сказаць... А факт, жана, ён заўсёды ёсць... факт, ты гэта разумеш павінна... Та-ак... А ежэлі я ўласнаручнае дзіцё вайсковай субардынацыі хачу вучыць, дык ты, жана, не рыпайся, ды слухай сама з увагай, бо субардынацыя—гэта таксама... факт. А факт—ён заўсёды ёсць... факт, ты гэта адчуваць павінна і разумець, таму ты не хто іншы там, а супружніца і законная сажыцельніца, можна сказаць, гаспадзіна ўраднікa, а ўраднік ёсць уласць, а дзе ўласць, там палітыка... І наогул, несць уласці, ашчэ не ад бога, як кажа наш паважаны айцец Панфіл... Ён-жа зерэй нашага праваслаўнага храма... А гэта таксама факт, і ніякіх тут сумненняў не можа быць...

— Я, канешне, не супроць факта... Але ў Зарэччы вун, кажуць, такі дом адмахаў сабе ўраднік, што па ўсёй воласці не знайсці, аж двое ганак ды пад гонту крыты, на дзве палавіны той дом, казалі людзі...

— Гэта як сказаць... Гэта, можна сказаць, чуткі ілжывыя, за якія і караць можна па законам нашага часу. Бо не ў гэтым годзе той дом з'явіўся, а калі фактам давесці, дык летась... Гэта раз... А падругое, яго Зарэчча майму мястэчку не раўня, гэта, не раўнуючы, як гледы прыстава да майго буланчыка. А галоўнае—гэта ўнутраны вораг... Там, браце, таго ўнутранага ворага—платы гарадзі, толькі знай—варушыся, ды палітыку праводзь, ды каб з розумам. А які ў мяне ўнутраны вораг? Салдаткі якія хіба, каторыя незадаволеныя. Відзімасць адна, а не вораг. На гэтага ворага і соцкага хопіць, з ім і староста справішца. Дужа ў мяне ворага ўнутранага мала, ніякага разгарнення, можна сказаць. Існуй-жа, камерцыя, скажам. Там адных маслабоек—з усяго павета возяць алей біць. Канешне і крупы дзяруць. І канешне і воўначоскі. Яно і ў нас ідзе на развіціе, але-ж Зарэччу не раўня. Калі-ж пра дом сказаць, дык я таксама не ў амбіцыі, не ў крыўдзе, так сказаць. Ты думаеш, што я такі ўжо чалавек

апошні, каб аб сваім дзіцяці клопату там не мець, чалавецкага абыходжання... А ну, каманда, змірна!.. Т-а-а-к... па ўсіх правілах субардынацыі... Кру-у-гом!..

Мурзаты падшывалец, які стаяў «змірна» перад сталом, чакаючы канца бацькавым прамовам, жвава павярнуўся за сталом, чакаў далейшага загада.

— А ну, каманда, шагам... а-а-рш!.. ідзі шчоты прынясі, сукін сын... А цяпер... кру-у-гом!.. айда бягом на зімнія кватэры...

Каманда як дужа кінулася на печ, падалей ад усякіх субардынацый.

— Дзіцё мардуеш, глядзі... аж схудняла на твар...

— Дармо... Не на ражку-ж мурло тое быць павінна. Яно каторае больш хударлявае, дык больш спрытнейшае... Дык вот ты, кажаш, дом... А я падлічу вот, тады і гаварыць можна, каб не абы як, а з фактам каб выступіць...

Тут і зашоў Банадысь.

Не адрываючыся ад шчотаў, нездаволена мармытаў ўраднік:

— Ты там, каторы, шапку знімі, дурань. Не ведаеш хіба, дзе знаходзішся.

Але ўгледзеўшы Банадыся мягчэй ужо:

— Дык гэта ты, браце. Ну, дык сядай. Па справе, відаць, ці так зашоў?

— Дызертыра я спаймаў, пане ўраднік...

— Што ты гаворыш? Дзе?

— Ды на балацяншчы... У стагу...

— Што ты? Як-жа гэта собіла табе, і дзе ён цяпер?

— Ды там-жа...

— У сене? Звязаў хіба? Пільнуе хіба хто?

— Не... Я, пане ўраднік, угледзеў толькі... Ляжыць вот і сапе сабе, спіць, можна сказаць, і храпе, выбачайце за слова, аж стог той калышыцца.

— Чаму-ж ты яго ды не згрыбчыў там? Вот-бы тады проста да мяне...

— Да я, пане ўраднік, без аружыя зусім... Каб-жа гэта я ды пры аружыі... А з голымі рукамі яго не возьмеш, можа пры ім сродства якое, паспрабуй-ка, паткніся...

— Гэта, канешне, так... Народ такі, што і рачанцы адбіць можа. З ім асцярожнасць сякую-такую мець трэба, бо злы народ, ён на ўсё папусціцца можа. Але-ж і далекавата гэта будзе...

Ізноў-жа, клопат, каб на яго нарад. Але што ты зробіш, давай-ка, жана, амуніцыю, шаблю давай, аружыю... Трэба вот толькі хіба панятых узяць, каб як след, па закону, па ўсіх, можна сказаць, правілах царскіх. Ды на вуліцы каго-небудзь напаткаем... Дык хадзем хіба...

Дагледзеў каровы Цупрон, вышаў з хлява, на сонца ўгледзеўся. І дзень марозны, а сонца куды ўгравае, асабліва ля сцен, у кутках зацішных. Угледзеўся на сонца, за каўняром чухаўся— былейка тое з трушанкі трапіла, саломіна там ці што. І дужа-ж гэта чухацца добра, на сонца гледзячы, вочы на яго жмурачы. Свярбіць гэта пад барадой, ды ў целе ўсім млявасць такая. У костках тых старых дрыгалкі сонечныя. Краніся рукой за бараду, далоняй да яе дакраніся—цёплая яна такая, нібы дух гарачы ідзе ад барады тае, сонцам аблашчанае. І самі сабой вочы плюшчацца. Хіліць да сна чалавека. Прысеў на бервяно Цупрон і толькі гэта падумаў:

«Вот яно сонца якое, вясну чуе, сілу-моц набірае, каб на палі, на жыты нашы...»

Ды й прыкархнуў крыху, задрэміў на палене тым, на хваёвым. Храпака задаў, аж каровы жвачку кінулі, заматлялі вушмі, прыслухаліся на хвіліну якую—ды зноў пачалі сена тое малоць, перамолваць, каўтаць жвачку салодкую, жвачку мурожную, сакаўную.

Любіў такі паснаць Цупрон Палажкін. Ці ад старасці то, ці ад дакукі тае, ад жысці тае сямейнае, як любіў часам казаць сам Цупрон.

— Ты, братка мой, падумай толькі, семера баб у хаце, а я адзін, і кожная табой паганяе, на карку тваім во-ўт як ездзіць, каб змаглі, у дамавіну раней часу загналі-б...

— А ты-ж гаспадар. Ізноў-жа, парадак ад цябе залежыць, даў-бы дыхту раз, даў-бы два, глядзі, і павага табе і шанаванне...

— Дзе ты бачыў, чалавеча, каб гэта дыхту... Ідзі-ка суньси да мае кампаніі—усе валасы абскубуць, калі жывога толькі з хаты пусцяць. Гэта, калі зачэпіш іх, такога скогату наробяць, такога вэрхалу: тут табе і аньцілерыя, тут табе і кавалерыя, ну проста эскадрон пяхоты...

— Не бывае, Цупрон, эскадронаў такіх...

— Можа яно дзе і нама, а ў мяне ёсць, што ты мне, чалавеча, гаворыш... Тут хаця гаспадаркі рашайся часам, да таго-ж дакука. Але і зноў-жа, свае, не чужыя...

І адно збавенне Цупрону—паспаць. Вольным часам якім, ці так, прымудраўся Цупрон, каб употайкі як, на гумнішчы дзе ці ўбіўшыся ў баразёнку на полі там ці гародзе, гэта калі летам. Нават каровы раз даіў і даіўшы спаць налаўчыўся. Паслала Палажка ў хлеў, чакае. А Цупрон прысеў, даёнку паставіў, цыркнуў разы са два. Дух гэта з даёнкі йдзе, паднімаецца цёплай парай, а тут лысая павярнула голаў, у самую лысіну чмыхае, грэе чалавеку макушку.

Разамлеў чалавек, прыхіліўся да сцяны, ды й заснуў. А Палажка—кабета суровая. Чакае, ды ўсё духу, спруту таго баявога набіраецца. Падвярнулася тут дачка.—Ідзі,—кажа,—падзівіся, дзе наш гіцаль стары запрапасціўся, пагібелі на яго ўжо нямашака... Пашлеш, як дурнога таго богу маліцца...

Прыбягае дачка тут.—Хутчэй-ка, матка, паглядзі, што ён нарабіў там, татка наш.—Тут за ёмашнік Палажка—ад старога дабра не прычакаеш—і хуценька ў хлеў. Толькі гэта ў хлеў—так і зашлася, налілася той злосцю вялікаю, набрыняла, на якую калі-б глянуў Цупрон—каб не спаў чалавека,—дык падумаў-бы з гора: «зноў-ткі завутраня пачанецца»... Але спаў Цупрон, салодка спаў, нават слюні на бараду пусціў. Спаў і сніў, нібы вот ён, Цупрон, вяселле спраўляе. Ды якое вяселле: узапар сем дачок пад вянец, жаніхоў гэтых сем... А сватоў ды свацця ў—крый ты, божа, памілуй, уся воласць сышлася. А ён, Цупрон, ды з кожным сватам па чарцы, ды са свацейкамі, ды з кумамі, з сваякамі тымі блізкімі і далёкімі, жончынымі і сваімі. І ўсё так люба, і сэрцу так міла, нібы ў каляды тыя чаркай па каўбасе, ці вялікодным днём па яечку таму свянцонаму, божай вадой пасвіцальнаму. І жонка, нібы вот Палажка гэта самая, і маладзей яна, і спрытней яна, і да яго куды лагадней: «Цупронька мой, Цупруньчык, ці-ж мы з табой сварыліся калі, ці то біліся, крый, божа. Хіба-ж нам з табой і пацалавацца грэх ды на гэтакім-жа вяселлі...» І ў самую гэта макаўку—плюсь. Ну як маселкам тым па душы. І раптам тут падыходзіць сват. Страшэнны такі, гіркліві. А за ім другі, а там трэці, чацверты... Ну проста, сіла сватоў тых навалілася, за грудзі ўчапіла. Ды ўголас усе:

— А ну, выстаўляй кублы, нечага ніціцца, добрых людзей чмурыць, на пасагах абманваць...

Дзе-ж ты тую сілу кублаў возьмеш, аж сямёра кублаў, ды і да кубла трэба: і сарочку якую, і падушку якую, і чаравікі там, ды й з адзежыны зноў. Ды й кожнае адзежы ды па сем набораў. Гэтак-жа й гаспадаркі не дзіва рашыцца. Умеючы, дык яно адным вобмегам—і ні каня табе, ні каровы табе, апошняе куранё на дзявочыя акрасы пусціш. На каленцы стаў Цупрон ды потым грымзель у масціну тую сукаватую.

— Братцы,—кажа,—не рэжце вы мяне без нажа, дайце шчэ на свеце пакрасаваць... Дзе гэта я вам сем кублаў, хіба скуру апошнюю...

А яны:

— Скура нам твая, налавеча, без патрэбы... мазалявая яна... ізноў-жа і прусамі пагрызеная, блыхой паскусанал. Палажчынай рукой абіваная... Без карысці яна, скура твая, чалавеча....

Ды чаўпель за бараду, а каторы і да горла пне. Аж змакрэў Цупрон, ды набраўшыся жаху, як крыкне. Тут і вочы прадзёр, глядзіць імі, лыпае. І ніяк чалавеча не дабярэ з просьпу, што гэта за такое ля самага носа матляецца. Працёр крыху вочы, бачыць: няйначай жончыны кулакі, вот так і завіхаюцца ля барады ды ля носа. А прачухаўшыся і голас пазнаў, і яе ўсю, і падумаў тут небарака пра завутраню.

— Будзе няйначай, без яе цяпер, браце, не абыйдзешся... Здаецца, каровы я даіў... Аднак, што яна да мяне мае, чаго чэпіцца.

А Палажка насядае, голас усё вышэй і вышэй, самі сабой Цупронавы плечы сцінаюцца, ды ніжэй апускаецца голаў.

— Ты гэта, ірад, нарабіў што? За чым цябе, супастата, паслалі?

Хацеў агрызнуцца, але змоўчаў: «Няхай ужо да канца даходзіць, чапаць яе цяпер, хужэй будзе».

А Палажка даёнкай ды ў самы нос тыча.

— Ты паглядзі сваімі паганымі вачыма, што ты з даёнкай зрабіў, супастата!

Зірнуў у гэтую самую даёнку Цупрон, зірнуў нясмела, падумаў з жахам: «а гэта, браце, хужэй завутрані будзе, што не вязе, дык не вязе». І сапраўды ніякага малака ў даёнцы, анізвання, адны лепяхі тыя, выбачайце, кароўі.

— Дык гэта-ж ненарокам,—пачаў было нясмела Цупрон:— ізноў-ткі—як відаць, карова гэта...

— А ты 'шчэ, надаўбень стары, сам-бы захацеў у даёнку можа... Ды ты, ірад... Да супастата...

І пашла, і паехала. Аж вочы заплюшчыў Цупрон. І толькі ён плюснуў вачмі, як вазьмі тут Палажка ды даёнкаю той у самую бараду і ўцэліла. Як плюхне ў бараду, тая і пацяжэлела. І дух з барады пашоў, цяжкі такі дух, парны, карові. Не сцярпеў Цупрон і сплюнуў нават, ды падняўшыся, пашоў раскірэчыўшыся і сагнуўшыся, каб світку тую не запляміць, да самага калодзежа. Аж да карыта таго нёс бараду, як гладыш з малаком, каб не разбіць, не растрэсці. Мыў доўга, пяском цёр, анучынай праціраў, кожную валасіну перабіраў паасобку. Угледзеў сусед, здзівіўся дужа, запытаў праз плот:

— Што гэта ты, чалавеча, за бараду ўзяўся?

— Праісшэсцвія, брат...—мармытнуў Цупрон і замаўчаў.

— А якое яно там праісшэсцвія тое?

— Ат...—махнуў рукой Цупрон і да хаты падаўся.

Хоць бараду і спаскудзіў крыху Цупрон, але-ж у сямейнай жысці, як ён казаў, крыху палегчыла. Толькі гэта надумаецца Палажка пад карову пасылаць і ўжо брывёй той навядзе сурова, ды схамяецца раптам: «А няхай ён, крый божа, сатлее часам... Пашлі яго на сваю галаву, дурыбалу гэтую...» Асцерагалася такі даручаць даёнку. Ды й сам Цупрон куды дасціпней стаў. Пойдзе, скажам, па мякіну там, на гумно, ды ўжо на ўсякі выпадак—калі, крый божа, сон усцігне—закрутку за сабой павярне, каб ніякага, значыцца, звонку прыступа не было. Жджэ часам Палажка, жджэ, і пашла на гумно следам. А тут і вароты зачынены і закруткай знутры як прылапаны. Тут ужо крычы, не крычы, хоць ты напал тут разарвіся, а яму не дадзенеш. Храпіць на тарпу, аж страха калышыцца. А прачнецца ад крыку, дык узлуецца 'шчэ, агрызацца пачне.

— Укусі вот сябе за калена, а хоць-бы сабе за мейсца тое самае...

Ды выхваляецца 'шчэ:

— Дужа я цябе баюся, думаеш... Вот цэпа вазьму ды як узлуюся, дык я цябе на мэтлахі тыя ізнішчожу, на порхаўку тую пакіну... Вот крычы, не крычы, хоць ты сабе залейся там...

Аж чырванела ад злосці Палажка, кулакі тыя сціскала, але паспрабуй ты дапяць да яго, не станеш-жа вароты ламаць.

А Цупрон агрызаецца. Надакуча яму, засне ізноў, дзе ты яго там падкалупіш. У поўнай, можна сказаць, чалавек небяспецы.

Праўда, знаходзіла часам Палажка доступ праз тыя дзверы зачыненыя. Дачку якую меншую пакліча, калі пад рукой, ці падшывальца там за лежанак тых жменю.

— Хадзі ўжо, маё дзетачка, старой мне падсобі. Вот злазь туды пад страху, бачыш, бярвенца дзе асунулася... Дык злазь, галубок, ды закрутку павярні, каб вароты як адчыніць, мякіны ўзяць...

А Цупрон сабе спіць, ні аб чым не шманае. Пералезе малы пад страхой, закрутку адверне, і пачынаецца тут Цупрону «завутрэня» поўная.

Другім разам, канешне, лез малы, ды потырч ляцеў назад, штаны тыя ў руцэ трымаючы, ды на ўсё гумнішча румзаніны той. Ды ўголас:

— Ведаю я цяпер, цётка, якая мякіна там... Хоць сабе пазуху цэлую лежанак насыпайце, але не палезу... Гэта вы, каб дзеда Цупрона біць... Вам добра, а мяне як спаймаў, ды з веніка дубцом тым...

Не вечна падпільнуеш аднак і малога. Спецыяльна гумно агледзеў Цупрон, кожнае бярвенца абмацаў, ды дзе каторае асунулася—новыя паўстаўляў. Каб быць усё-ж у поўнай небяспецы. Суседзі смяяліся: «Для завутрані Цупрон стараецца...» А каторыя салдаты, на фронце якія пабылі, дык тыя дзедава гумно няйначай як цупронавым газаўбежышчам называлі, ад Палажчынай напасці той ды наступа яе.

Пачалася-ж «завутраня» яшчэ даўно. Было дачок тады ў Цупрона мо' ўсяго 'шчэ з пяцёра. Пашоў гэта Цупрон у вялікодную ноч пасху свяціць. Ці страсці тыя гаспоні яго змарылі, ці за дзень чалавеча наверадзіўся, але-ж толькі вочы тыя так і ліпнуць, так і плюшчацца. Плюшчацца вочы, галава хіліцца долу, не да розума і словы тыя святыя. Таго і глядзі, лубачка ліпавая плюхнецца аб падлогу, дай ты тады пасцы той рады. «Парасё 'шчэ ўцалее, а яечкі кокнуцца, ні за што, ні правошта могуць загінуць яечкі». Падумаў так, ды бокам, бокам з царквы, вышаў гэта на цвінтар, ды ля парканчыка пад ліпаю і прыкархнуў крыху. Ды лубачку ліпавую, каб хто не сцёг, да боку бліжэй прыгарнуў. І спіць сабе чалавеча. Тут ужо й страсці прашлі, і ўзваны як след ударылі на самы той на «хрыстос-уваскрос», ца-

лаванне прашло, прашла тая завутраня светлая, вышаў поп з крапідлам яйкі свяціць. Добрыя людзі і разгаўляцца пашлі, а Цупрон спіць сабе, ні на што не шманае. Добра, што Лаўрэн натрапіў. Прышоў гэта чалавек, каб званіцу адамкнуць на звон той вясёлы, велікодны. Забраўся на званіцу, бумкнуў разы са два, і зір па ніз. А там чалавек над ліпаю. Пашоў Лаўрэн да яго, бача—Цупрон храпе і лубачка тая ля яго абернутая, усе яйцы патрушчаны і з пірагоў—адна відзімасць—наваліўся на іх бокам Цупрон.

— Пане Цупрон,—будзіць тут Лаўрэн чалавека.—Што ты надумаўся, браце, хрыстос табе васкрос тым часам.

Прадраў той вочы, і за галаву схапіўся. Не да хрыстоса тут, можна сказаць, Цупрону.

— Хіба 'шчэ не свяцілі?

Скеміў тут Лаўрэн, што з чалавекам няйначай як праішэсцвія здарылася, ды ўжо як мага ласкавей,— а самога нясцерп бярэ, так і бярэцца за бакі—вот-бы ў рогат пусціцца.

— Яно, браце, можна сказаць, пасвяцілі, здаецца... Даўно, мой голуб, пасвяцілі... Дзівіся то, сонца на паўзваніцы, на гару ўзбіраецца... кали то ўжо свеціць...

Тут і самлеў Цупрон. А на лубачку як зірнуў, тады і зусім асеў, адно толькі вочы лупаюць.

— Божа мой, божа, а парасё тое дзе-ж падзелася? Парасё-ж тут у мяне было, 'шчэ са свечкай—дзяўчаты ўбіралі... Гэта-ж не жарцікі, каб ля царквы парасё красці... А куды я цяпер яйкі гэтыя падзену. І куды пайду я? Мяне-ж капэля мая жыўцом пакладзе ў дамавіну, не паглядзіць і на дзень велікодны...

Пашоў Цупрон дахаты, туляючыся, людзей абмінаючы. Дзіва то і сонца дзе, а ты тут з лубачкай. Лацве шчэ'—добрыя людзі разгавеліся і спяць сабе ды пупы пагладжваюць, адна малеча на вуліцы яйкі катае. Ёй то, малечы, канешне, не ўздагадкі Цупронавы дзялы. І добра яшчэ, прыдбаў у Лаўрэна колькі тых яец, пасвіцаных, другой праўда фарбы: у яго, у Цупрона, цыбулькавыя былі, чырвоныя, а Лаўрэнавы сонам баравым падфарбаваныя, зусім, можна сказаць, другія яйцы.

Так і дахаты дадлыпаў. А там ужо прачакаліся даўно, прагаладаліся, як след, на разгавіны тыя спадзяючыся. Увашоў у

хату, пахрыстосаваўся нясмела, да лубачку тую паціху на стол паставіў.

— Дык хіба пачынаць будзем?—а сам хуценька ўз самы покут, каб у выпадку чаго падалей быць ад рук тых Палажчыных.

Тут і ўзяліся. Шчэ ў лубачку не глядзеўшы запытала грозна Палажка.

— Дзе гэта цябе нячысты дух,—даруй мне божа за слова такое ў дзень святы,—дзе гэта, кажу, чэрці цябе насілі, і ці не ў пролубку ты трапіў часам, няпутная твая галава?

Сцярпеў знявагу Цупрон, паціху так:

— Ты-б разгавелася хаця, а тады-б ужо... апасля, адным словам...

Узяліся тыя за лубку, ды войкнулі толькі, усёй гэта капэляй палажчынай. Мімаволі Цупрон на качарэжнік зірнуў, крый божа,—возьмуцца ўсур'ёз... Але, дзякаваць богу да дню святому, пуставаў качарэжнік той,—ні вілашніка, ні ёмкі таё паганае... Вынеслі для свята ў сенцы, каб у хаце чысцей. Трэба сказаць, лужа на ёмку тую рука Палажчына была напрактыкавана і ад рукі таё лепш далей куды ў ліхія часіны. Зірнуў Цупрон на качарэжнік і на душы лягчэй стала, яйцы пачаў лупіць, яйцы тыя Лаурэнавы, што сонам баравым падфарбаваны.

А капэля ніяк не утаймуецца.

— Ты гэта кінь яйцо, ды адказвай мне,—насядае Палажка.

— Як гэта кінь? Пасвіцанае яйцо каб кінуць?—нават смеласці пачаў набірацца Цупрон.

— Ты зубы не загаварвай... Не пра яйцо кажу... А лупіць кінь... Дзе парасё, храстапрадавец, падзеў? Гэткае парасё, малаком шчэ адпайвалі... Дзе-ж ты яго, душагубец, збайсаваў? А яйцы, вочы твае паганыя, чые ты яйцы прынёс?—насядае Палажка і сама ледзь не плача—дужа-ж парася таго шкода. Лепшае парасё, можна сказаць, ад свінні ўзяла, каб дзень святы сустрэць, як і добрыя людзі.

Памеўся было Цупрон на дурыкі кінуцца, каб час адцягнуць, а мо' яна, тая жончына злосць, і ўходуецца як.

— А ці было яно калі і парасё тое ў лубачцы, ненарокам кажучы, быццам я там і не бачыў яго... Гэта-ж падумаць, каб парасё ды ў лубачцы... Ды каб, скажам, з лубачкі зноў...

Сказаў і сам не рад быў, да таго-ж узюшылася ўся капэля, а найбольш ад усіх Палажка.

— Вот як працераблю табе вочы сляпыя, дык зноў убачыш і памяць дурную на мейсца пастаўлю... Ці не табе, гіцаль стары, казала, каб парасё пілнаваў, каб свечачка тая з зубоў не выпала...

«Кепскія, браце, паперы выходзяць»—падумаў Цупрон, ды пасунуўшыся хуценька глыбей на кут, апаў духам, прасіцца пачаў:

— Любыя вы мае... Як ніяк, а ўсё-ж вы свае, дайце хаця святым днём надыхацца... Як на чыстую тую паперу—усе выкладу. Стаяў-жа гэта я ў царкве, стаяў... Лубачку тую ўсё пілнаваў... Тут і завутраня падыходзіць, я стаю, хоць-бы раз на вуліцу вышаў. І вот праходзіць і завутраня, ужо народ за пратасэі ўзяўся, ужо на крэсны ход з царквы пашлі. І такая тут тузаніна пашла, не дай-жа ты божа... як бачыш, і пірог падушылі крыху, памялі, здаецца... Ну, паставілі гэта мы лубкі ля сцяны, ідзем крэсным ходам. Раз прашлі, два прашлі і яшчэ трэцім разам прашлі. Тут і кінуліся па лубкі мы. А цемер—палец на вока пастаў, не ўбачыш... І відаць...

— Што відаць?

— Здаецца, вот.. і пераблыталі лубачкі... Можа той чалавек і душой не вінаваты, які, скажам, узяў заместа свае маю лубачку..

— Як гэта ўзяў? Гэта-ж наша лубка.—І тыц гэтую лубку пад самы нос Цупронаў.

Паглядзеў з апаскай Цупрон, згадзіўся нехаця:

— Здаецца, наша лубка... Сапраўды наша... Шчэ летась ліпку абадраў у панскім лесе на выгарах...

— А яйцы чые,—пытаю?

Паглядзеў на тыя яйцы праклятыя, уздыхнуў:

— Што казаць!.. Няйначай, не нашы яйцы... Гэта-ж можна сказаць, галянскія яйцы, а ў нас-жа звычайныя...

— А парасё дзе, супастата?

— Дык кажу-ж табе, пераблыталі... Цемер, кажу, вялікая была... Такая цемер, што крый божа. Можа хто і ўзяў парася ненарокам. Як пасля завутрані гэта мы...

Тут і пачалася Цупрону «завутраня», колькі то год у памяці стаіць з таго дня.

— Ты гэта мне пра завутраню не гавары... Ты мне туман у вочы не пушчай... Ты мне вочы свае бессаромныя не хавай... Вот

з цябе порах будзе сыпацца, калі я ды сваёй рукой за цябе ды вазьмуся..

Што і казаць, туга давялося Цупрону, бадай палавіну барады тады страціў у калатуху тую хатнюю, велікодную... Шчэ добра, дзеўкі застоілі. Ці надакучыла звяга ім, ці ўрэшце не мага было разгавін тых чакаць далей—дзіва то, постам духі падвяло, ледзь ліпеюць пупы, да касці папрысталі—але-ж застоілі: вунейка дзе, з мы 'шчэ і за скароміну не браліся...

— Кінь ты ўжо, маці, рукі святым днём паскудзіць аб супастата... Хоціць яшчэ і другім разам, ні дзе дзенецца... Сонца

Застоілі такі...

Далася тая «завутраня». Аж на цэлы дзень з хаты сышоў. Залез на званіцу з гора—туды малеча хіба адна ды хланцы маладыя лазілі—ды ад жысці тае сямейнае, празваніў цэлы дзень у святыя тыя званы велікодныя. Каб на сэрцы крыху лягчэй, каб глянец хіба які на душу навесці. Старанна біў у званы, так біў, што Лэўрэн—наведаў званіцу чалавека, каб парадак быў—заўважыў нават:

— Ты, пане Цупрон, з такім імпэтам б'еш, што можаш і ўшчэрбіну нагнаць на звон. Стары, браце, гэты звон, колькі то лецеек б'юць, ледзь ліпіць... А ўшчэрбіш—і звон не звон, а біты той гладыш бабскі, ніякае красы табе, ані гуку... Дык ты хаця, пане Цупрон, спакваля бі...

Дужа там спакваля, пасля «завутрані» такой.

Дык вось якая была «завутраня» Цупронава. Пасля, канешне, баяліся Цупрону пасху даручаць, самі дзеўкі пасвіцаць насілі. Што-ж, абы клопату меней...

... Спаў Цупрон на палене хваёвым, на зімовым тым сонцы завіцным, праграваў свае косткі старыя. А ў хаце бабы парадчылі, спраўлялі дзялы свае бабскія. А тут і Аўгіння зашла, самая старшая дачка, што замужам за Сілівонам Мялавым. Прышла вот проста так у даведзіны: як маці там жыве, як сёстры скачуць. Ні то што, каб жалкаваць, на Сілівона крыўдаваць. Не з такіх Аўгіння, каб за чужою дапамогаю кідацца, каб гора сваё на чужыя рукі разносіць. Сама сабе давядзе парадку. Але матка зноў-жа, дужа ад яе хаваца будзеш.

— Дык б'е, кажаш?

— Біць каб гэта, дык рукі кароткія... Але-ж грызе... Як грызь грызе, не дае табе супакою ні днём, ні ўночы... Ды што казаць,

каб займеў, дык горла-б табе перагрыз, жывасілам-бы зацёг на клодаўе... Такі-жа чалавек суровы... Гіркавы чалавек... І нелюдзь... Усё адзін, усё адзін... Дзе ты яго бачыла, каб у кампаніі, каб з людзьмі. Так, як воўк той і соўдаецца. І ў лес адзін, і шула там ставіць—адзін, выбярэцца ў горад калі, то пілуе, каб-жа аднаму не выехаць, з людзьмі не блытацца. Дужа-ж чалавек не кампанейскі, і ад людзей дзікуе... А да мяне ўсё чэпіцца. І то яму не ў лад, і гэта яму не да парадку... Пагражае ўсё. Я табе, кажа, памяраць буду, а не папушчуся. Здыхаць буду, гаспадарку рашу, каб нізвання табе ад яе, ані каліва таго на развод. У дамавіне, кажа, буду ляжаць і тады на цябе не забудуся. Па начах тых змеем прыпаўзу падкалодным, усю кроў тваю, краску з тварэ твайго ссушу, каб ні яснага сонца табе, каб божага свету ты не бачыла, каб кроў твая сукравіцай, бледнаю немаччу цябе агарнула... Дужа, мамка, страшкія словы ён гаворыць... Цяжкія словы, калі гэта ў злосць уваходзіць, да мяне чапіцца ўчне. І вочы тады не вочы, не чалавечыя тыя ясныя... Чырвоныя вочы, крывёй заліваюцца, калі злосцю той набрыняе, узлуе не палюдску... Так і пілуецца тады, каб ні нажа дзе, ні сякеры там паблізу. Касу і тую схавала, аж пад самую страху ў клеці, ці мала там што, калі ўсходзіцца... І так вунь паленам раз у дзіцё шпурлянуў... Шчэ добра такі—собіла адхінуцца ў часе, адну толькі зыбку і задзеў, пашчыпаў крыху... Цяжка, маці, дужа цяжка з чалавекам такім... Як рыба тая ў прыдуху, б'ешся часам... Зычыла мяне жыцейка з ім, у ліхія гадзіны спалучыла... Часам-бы кінула, рашыла ўсё лы ў белы свет за вачыма... Дужа крыўдна, маці. Не жыццё,—адно званне толькі, адно хіба—сказаць, без пары, без часу... Цяжкі чалавек, супорлівы.

— І чаго-б то яно?

— А я ведаю?..

— Хіба-ж ублагаць яго нельга чым, улагодзіць як-небудзь?

— Сырая магіла яго ўлагодзіць...

— Хіба ці не за Аніса ён на цябе злуе?

— А калі і за Аніса. Хто вінаваты тут, ты сама памяркуй...

Задумалася Палажка. Куды цяжэйшая тут справа, чым, скажам, з Цупронам управіцца. Але-ж нелк паратунку таго шукаць трэба, усё-ж свая дачка, кроў, можна сказаць, не чужая.

— Хіба схадзіць вот мне да Сілівона праведацца?

— Ды што ты, маці... Калі й кажу я, дык так, каб ведала ты як свая... Мне твая помач тут без карысці, узлуе 'шчэ больш. Я і сама як-небудзь дабяру пуця таго, можа яно і палепшае як крыху.

Але дзе ты матку ўгаворыш. Дзе ты Палажку з думкі яе саб'еш.

— Гэта, дачка, кінуць так нельга. Дараваць, кажу, Сілівону нельга, раз ён на голаў лезе, жыццё тваё маладое марнуе... Ізноў-жа, бацька ў цябе ёсць родны, павінен ён за дзіцём глядзець, дапамагчы яму, калі трэба. Няхай вот да Сілівона сходзіць, балазе і дзень святошны, дзень вольны.

— Гэта ўжо не... Што ўжо сабе хочаце, а зачым тату пасылаць дарма. І так ён у нас заняхлюдзеў задужа, бацька гэта. 'Шчэ ўзлуе Сілівон, дык дзялоў тады не абярэшся. Хіба сіла ў таткі Сілівонава, каб памерацца, скажам. Ніяк не выпадае туды татку ісці. Ізноў-жа і ўзлуе яшчэ больш, на мяне ўслрдуе, Сілівон гэта мой...

— Дзе ты бачыла... Што ні кажы, а мужчына-ж ён, Цупрон мой. Каб гэта мужчыны да не давялі парадку... Не дагаварыліся між сабою... Няхай вот ідзе пакліча там, каторыя, Цупрона мне.

— Ат... рабіце, што сабе хочаце... Дужа мне клопат...

Раскатырхалі Цупрона на палене тым, на хвасым, у завішным тым угрэве сонечным. У хату прышоў, з дачкой паздароўкаўся. І пачала тут ушчуваць яго Палажка.

— Стары ты гіцаль, сапсеў зусім ад сна таго, а таго не бача, як дачка мардуецца, на белым свеце гібее. Адразу-ж да Сілівона, управу павінен знайсці, срэдства на таго чалавека... за жылле супастата вазмі, ды як след, каб дачку застоіў, родную дзіцю тваю, можна сказаць...

Наважыўся слова якое сказаць Цупрон, ды дужа тут позірк той грозны быў. Палажчын той позірк у качарэжнік. Пачухаў пад барадой, зірнуў скоса на кут той самы, ля печы што.

— Дык ты хаця пастой... Мо' я й пайду, часам...

І зусім разышоўся.

— Ты ўжо не чаніся хаця, сляпіцай той у вочы не лезь. Пайду, няйначай... Здаецца мне, што пайду... Ён у мяне не ўцячэ, паплача можна сказаць. Ужо дабяруся я да яго... Жыўцом, можна

сказаць, не выпушчу з рук... Гэта-ж трэба, рахуба такая, каб праз яго і маю жысцю трывожыць...

Узяў світку святошную, наматаў хусцінку на шыю, чыстую, чырвоную. Пастаяў з'хвіліну, падумаў і рашуча ўзяўся за клямку.

— Я ўжо да яго дабяруся...

6

Шчэ з таго часу, як згарэла гумно панскае, акрыяў неяк духам Іван Іванавіч, нават весялейшым стаў крыху, і хада тая пажвавела, панурыя вочы зрабіліся на больш рахманыя і спрытнейшыя.

— Як памаладзеў каваль наш. З чаго-б то? Хіба на жаніцьбу думку займеў? Але-ж не відаць нешта гэтага,—казалі часам людзі.

І на маладосць тут прычыны былі. Дужа быў бежанства час цяжкі. Для ўсіх цяжкі, а для Івана Іванавіча ўдвая. Працавалі раней з братам у горадзе на невялікім заводзе, жылі разам, сям'ёй адной. Матка была ды жонка з невялікім дзіцём. Брат маладзейшы, нежанаты яшчэ. І жылі сяк-так, аб сям'і дбалі, не забываліся і на справы тыя людскія, справы агульныя. А забыцца было нельга, пра баньбу памятавалі. Кінуў ён іх усім яшчэ падшывальнамі, на пагельні тады працавалі, хлопчыкамі яшчэ, можна сказаць, цягалі цэглу ў сушыльню. Год быў тады сумятлівы, неспакойны, фабрыкі ды заводы гулі нібы гудам шмяліным, і ўвесь горад быў, як разварушаны муравейнік. Таго года і рашыліся бацькі. Прынеслі яго аднаго вечара суседнія людзі дахаты. Быў ён збіты, скрываўлены, усю падлогу крывёю захаркаў. Ці то казакі яго дзе засеклі, ці чорная сотня ўсцігнула,—не маглі тыя людзі дакладна давесці. Казалі толькі, што на маніфестацыі ля завода здарылася тое нящчасце. Суцяшалі яшчэ:

— Ты, маці, не кідайся дужа і рукі ламаць тут нама чаго... Не з ім адным... У цябе вунь сыны яшчэ, можна сказаць, лоб у лоб... У самы час, каб у работу як след рукі сыновыя ўкінуць, у гадах хлапцы, карміцеляў маеш, маці, не гняві бога слязмі... Вунь у суседкі твае і мужыка забілі і сына скалечылі... До-оля—яна, можна сказаць, наская доля... Жыў-жыў чалавеча і рукі на крыж, ды каб надумам сваім, яно-б тады і крыўды тае не было... А то-ж бачыш, смерць тая прымусовая, нахабная... Ды на нашага

брата ўсё мерыцца... Дык ты не журыся дужа, кабеціна, жывы яшчэ, а мо' і акырхае як...

Суцяшалі.

Чалавек і жыў яшчэ, месяцы са два працёг, усё кырхаў.

Але зачаўрэў зусім і вечара аднаго паклікаў сыноў да сябе.

— Так што, відаць, не даводзіцца мне жыць з вамі болей... Можна сказаць, водныя вы цяпер назусім, не ўказнік я вам і не наставіцель... Жывіце як лепей... Ды глядзіце толькі, каб бацька ў вас з памяці не сышоў... і смерць бацькава... Адно, што скажу яшчэ—ніколі не ўпрачайце добрым людзям, не станавіцеся поперак на іхнай дарозе, хоць-бы тая дарога была крывёю заліваная... А цяпер, як сабе хочаце...

Таго вечара і здаўся бацька.

І можна сказаць, не сыходзіў ён з памяці сыноваў, дбалі яны аб ім, стараліся, наколькі было сіл тых і розуму. Разы са два брат у астрозе адсядзеў за фабрычныя дзялы, быў ён куды спрытнейшы і на слова астрэйшы, дасцігаў да ўсяго хутчэй. І не мінаваць яму-б воўчага білета, каб не падаспела тут бежанства. У завірусе кінулі ім цікавіцца асабліва, а тут і давялося ехаць з родных мейсц, ехаць на новыя, няведамыя пасялішчы, ратуючыся ад вайны, шукаючы кавалка хлеба. Ехалі цягніком таварным, але ўсяго толькі і праехалі перагоны са два, як замялі ўвесь цягнік казакі, пазганялі народ з вагонаў.

— Можаце і пешкі пайсці, не паны вы і не граф'я, публіка вы звычайная, бежанская... А вагоны нам і пад снарады патрэбны. Можаце, адным словам, ісці, не задзержывайся каторы...

У самую позняю восень надаспела справа тая. Пакутвалі колькі дзён, матляліся па Белавежскай пушчы, без ежы, без прытулку, і тут давялося рашыцца дзіцяці, азызла на дажджы ў дарозе, пасінела, звяло тварык у змаршчакі старэчыя ды так і звянула. Закапалі наспех пад елкай, крыжык дубовы згоралі, паставілі, паглядзелі ў вочы адно другому, і жонка як кінецца тады вобзем на ігліцу тую калючую ды голасам немым як закрычыць, загалосіць. Здаецца, сэрцы ваўчыныя працяліся-б жалем ад таго голаса, ад слоў тых простых, матчыных слоў, звычайных. А ў самога ў сярэдзіне неяк захаланула, ды думкі, як жарства, як камень, як суровыя хвоі белавежскія. Стаяць гэтыя хвоі, не шалохнуцца, толькі вецер гудзе ў верхавінах, асыпае з нябес макрэддзю, працінае восенскай золлю. Суровыя тыя хвоі,

пракаветныя, дакраніся камяля—загудзіць працягла гэтак і глуха, як звон той па мерцвяках пахавальны. Сярод хвой дарогі—пясок, жвір, верасы паабапал. У самым цвеце былі верасы тады. Цвітуць верасы, няўлоўны пах ад іх, і кладзецца ён жалем вялікім і нязведаным на людскія сэрцы, жыццём абіваныя.

Дужа доўга будуць памятацца верасы тыя і суровыя восенскія хвоі. Ды камень той, над які давялося пасля і жонку паклясці. Усё адно да другога: і дзіцё, дарога позняя тая, восень з беспрасветнымі і халоднымі начамі—і застаўся адзін, як перст. Хіба брат яшчэ ды матка. Выкараскаліся сяк-так з бежанскае тае бяды, да мейсца дабраліся. Брат на службу пашоў, на завод, дабіўся там зручнай вакацыі. Усё да сябе клікаў, каб ізноў гэта разам як калісь раней. І матка з братам была. Але як трапіў адразу ў мястэчка, тут і загруз у кузні, і не хацелася нанава кратацца. Пазбыцца ўспамінаў тых цяжкіх не мог, усё стаяла ў памяці як жывое і жыў, як звязаны чым. І сутуліўся неяк раней часу і іней на галаву ўпаў, занапалі вочы, бляску таго колішняга ў іх не ўбачыш. Так і жыў без гора таго, здаецца, але і без радасці тае асаблівае. Адна ўцеха з сялянамі каторымі пагаварыць ды моладзь вот яшчэ. Тая моладзь, каторая вочы мела, у каторай яшчэ не астыглі грудзі, каторая і на свет яшчэ глядзіць не жмурачыся, на поўнае тое вока маладое, рукой яго ад сонца не засцячы. З ёй хіба і адводзіў душу, раздзьмухваў угалькі тыя, што тлелі дзесьці глыбока ў сэрцы.

І вот акрыяў Іван Іванавіч духам, весялейшым стаў. 'Шчэ невядома было, хто тое гумно спаліў, і як спаліў, з якімі, можна сказаць, думкамі яно было спалена. Але-ж расцвіла тут радасць вялікая, і свет куды мілейшым стаў. «З гэтым светам 'шчэ можна памерыцца, на свой капыл яго пераставіць». І калі гарэла гумно, і шоў тады Іван Іванавіч пасля крыўд гаручых ад прыстава—падумаў тады:

— Правы ты быў, бацька мой, у думках сваіх правы, у словах сваіх... У адным ты аднак не правы... Не ўпрачайце добрым людзям на іхнай дарозе, хоць-бы дарога тая была крывёю заліваная... Гэта, канешне, і хіба я тут супроць... Але-ж не галоўнае гэта... Не толькі не ўпрачаць, а дапамагаць трэба дарогі тыя шукаць, якія-б крывавыя яшчэ не былі... У гэтым, відаць, і праўда наша... І гэта праўда, відаць, узнеслася полымем над панскім гумном... Але ізноў-жа згасла, сацмела... Бо дарогі, відаць, шы-

рокае тае не было... Шла праўда тропкамі цёмнымі ды глухімі, сцежкамі тымі лесавымі, віхлястымі, мужыцкімі сцежкамі... Выйсця ніяк не магла знайсці на шырокія дарогі, бітыя... А хто-ж вінаваты ў гэтым? Топчуцца людзі, з бітае дарогі ў балота кідаюцца...

Тут узгадаў Іван Іванавіч Лаўрэнавы наведзіны. Аж здзівіўся Іван Іванавіч госцю такому, ведаў Лаўрэна за чалавека набожнага, да царквы старальніка, да слова святога прыхільніка найвялікшага. А той прышоў, запытаў для прыліку аб шворне—ці не можа ён—Іван Іванавіч—шворан новы паставіць у калёсы, бо рэпнуў стары, так-такі напал і рэпнуў, мусіць-жа жалеза папалася бракаванае.

І сам Лаўрэн ведаў, што пытанне яго не дарэчы: як гэта, каб каваль ды шворна не мог зрабіць, звычайнага шворна немудронага да сялянскага ваза. Гэта-ж не малатарню агледзець, не барабан які для крупадзёркі зрабіць. Самае, можна сказаць, простае дзела—шворан той самы. Але-ж запытаў для прыліку. Пасля мяўся ўсё, мымрыў пад нос. Пра газеціну—«мо-б ты, чалавеча, даў пачытаць навін тых», пра кніжкі каторыя. Урэшце загаманіў, паставіў язык на больш цвёрдае месца. Трымаў важна газетку ў руцэ, але чытаць каб, дык больш гаварыў.

— Я вот, Іван Іванавіч, часцяком, канешне, і газеціну ў руцэ патрымаю... Усё больш на тыя епархіяльныя ведамасці налягаю, балазе поп не шкадуе, дае пачытаць часам. Адиак, я чалавек куравам не балуюся, газеціика, можна сказаць, у поўнай у мяне бяспецы. Ну, той і давярае, не баіцца, што я парву там ці на цыгаркі тыя пушчу, грэшным часам... Дык вось, чытаю, кажу. І сказаць, каб дужа гэта радавала мяне, дык не... Праўды, сказаць табе, не віжу я ў тым слове друкаваным. Усё я вычытаць хачу, якая яна, як да яе дасцігнуць. А газеціна кажа мне толькі пра камілаўкі, пра скуфі ды набедранікі—вот аднаму папу там далі, другога там надарылі, трэцяму панагію на грудзі ўшчапілі.

— К чаму-б гэта? Хіба, праўда, скажам, у панагіі той, у крыжы тым срэбным?.. Альбо пішуць яшчэ, якія правы маюць папы на зямлю і што рабіць, якія законы на ўвазе мець трэба, калі, скажам, у папоўскім лесе пасечкі пойдуць, ці на папоўскую мяжу хто ўзваліцца... А навошта, пытаю, папу зямля? Ці з яго так мала? Ці, скажам, недалёка за прыкладам ходзячы, навошта нашаму папу млын? І ці зручна духоўнай асобе справамі такімі

займацца? Калі ўжо на тое пашло, калі табе так закарцела, дык скідай рызу, станавіся ля жорнаў ды засыпай на здароўе. А то, духоўная, можна сказаць, асоба і раптам інтэрас такі. Канешне, аб нашым папу і казаць няма чаго—ад папа адна рыза засталася. Любога п'яніцу пераб'е, любую бабу змусціць, а грыўню, каб лішнюю сабраць, дык чорта перасцігнуў-бы. Канешне, абы каму не дужа я гавару аб гэтым, бо каторае яно і да ладу не дабярэ, што к чаму. Што і казаць, я і ў папа, канешне, пра сёе-тое пытаў, ды дзе гэта ён табе адкажа. Ты яму пра дзела якое, а ён табе Ісуса Навіна прыпляце, ты яму пра зямлю, а ён на хрыста спасылаецца... Канешне і я ў ісусах там да хрыстах добра такі разбіраюся і толк некаторы маю... Але ізноў-жа—мёртвыя словы ўсё. Чытаеш, чытаеш, а сэрца, можна сказаць, не кратае. Зусім, трэба сказаць, сэрца пустое. Бо як не круці, а багатаму чалавеку і бог спрыяе ў сваім тым святым пісаніі. І ў бібліі, значыцца, ізноў-жа і ў евангеллі...

Дзе-ж пытаюся, справядлівасць тады? Дзе-ж яна тая праўда чалавечаская, і якім пісаніем праўду тую пасцігнуць можна?

Лаўрэн пытаўся пра праўду, і відаць было, што пытае ён проста так, ад звычайнае тае цікавасці людскае, ад халоднага людскага розуму. Не прыкіпела тая праўда да нутра, да сэрца яна не прыстала. І голас таму быў не ўзрушаны, не было цяплыні ў ім, не было таго хвалявання, душэўнага мятушэння і ўсяго таго, што ўласціва чалавеку, калі ён праўдай той чалавечаскай за жывую душу працяты. Адзін быў голас: і аб шворне тым, што напал, і аб праўдзе людской, вялікай.

І калі выслухаў Іван Іванавіч Лаўрэна, адказаў толькі:

— Сыты вы чалавек, пане Лаўрэн...

Дужа гэта чалавека здзівіла. Узрушыўся нават.

— Як гэта разумець вас, слова гэтае к чаму? Сыты? Яно, сказаць, і вы-ж вот не згаладаваліся... сякі-такі кавал хлеба да вашых-жа рук горнецца, няйначай...

Зусім тут заблытаўся Лаўрэн. Нават роўнавагу сваю, думкі разважлівыя, узважыстыя,—усё разгубіў.

— Смяецеся вы з мяне, Іван Іванавіч... І, можна сказаць, над старым чалавекам смяецеся... Не чакаў гэтага ад вас, зусім не чакаў... Я да вас з сэрцам шчырым, я да вас як да разумнага чалавека, як да голаса таго, да якога прыслухаюцца, а вы—смешкі строіць, над старым чалавекам—гэткае-ж выдумляць... Крыўдна

дужа мне, чалавеча... Нават устаў Лаўрэн, асцярожна газету на стол паклаў, нерашуча на мейсцы затупаў, на дзверы тыя зірнуў.

— Крыўдна, кажу, сапраўды крыўдна... Гэта чалавека, ды каб у цёмны лес пускаць, няхай там блудзіць... А нам, маўляў, што... шкада хіба чалавека таго... Няхай паскача, маўляў, па купінах, па пнеўніку, ногі паламае, паскручвае.

І тады засмяяўся Іван Іванавіч. Цёплым такім смехам, чуллівым.

— Дзіўны вы чалавек, пане Лаўрэн... Не нашага веку чалавек... Вас-бы сапраўды куды ў лес пусціць, на купіну тую пасадзіць, ды евангелле ў рукі... Харашо. Сонца гэта вам у лысіну свеціць, камарыкі кашу таўкуць, галубы лесавыя на бярэзіне белай галубовыя справы ладзяць, траўка расце, распускаюцца кветачкі, кругом чарвячкі, мурашкі ўсякія, божыя тыя казюркі... І да вас ад іх ніякай, можна сказаць, цікавасці... Пра шчаку вы чытаеце пра тую правую, пра сарочку апошнюю... І ўсё яно харашо, усё яно йдзе так суладна, любамірліва. Ні вам гэта хто па шчацэ той не лясне, ні вам каму даць па правай, ці па макаўцы той, па лысай... Харашо, гэта значыцца, выходзіць па пісаніі. Буква па буквіцы—і законы божыя... Тым часам, не ў лесе вы. І заўважылі вы, што поп не дужа ласы не толькі левую тую шчаку падстаўляць, але, крый божа, каб падставіць і правую... Пра апошнюю сарочку гаворыць, а сам ля гарцаў тых, ля апошніх тых гарцаў сялянскіх душа як завіхаецца... Залішне нават, як кажаце вы... Ад папа, канешне, адна рыза засталася... Та-а-к... Заўважылі гэта вы і жахнуліся: як-жа гэта так, калі ды супроць буквы тае святое выходзіць... Як-жа так, калі і ў самым пісаніі божым адно другому супярэчыць часам, буква пашла супроць буквы... Скажам, пра апошнюю сарочку, ды скажам і аб тым, хто шмат мае, якому шмат яшчэ й дасца...

Вось і выходзіць, што думкі тыя вашы на балоце ўзрошчаны, а не на людзях... Буквенны вы чалавек, пане Лаўрэн, і праўда тая ў вас—буквенная праўда. Вот каб ляснулі вам па шчацэ добра, каб пашлі тыя валдыры па душы, каб задзела вас, выбачайце, за самыя печані—пачалі-б вы тады сапраўдную праўду шукаць. І зусім з другога канца шукалі-б яе. А пакуль што шукаеце ад сытасці... Таму і сказаў я, што сыты вы чалавек і крыўдаваць тут, кажу я, не трэба. А сыты чалавек і сытая праўда ў яго, кульгавая праўда... Шукаеце вы яе, людзей ды людскія дзялы мі-

яючы. А без людзей праўда не бывае, і людзі той праўдзе характар даюць. У багатага яна адна, а ў беднага зусім другая... Дык вось якая яна праўда чалавечаская, аб якой пытаеце вы... А шукаць тую праўду трэба ізноў-ткі на людзях, сярод нас усіх... Тут яе і пасцігнуць можна...

Лаўрэн шапку мяў, усё прыглядаўся, чаму яна, тая шапка, ды такая ўжо лысая—выцерлася мусіць аб тарпы, аб скірты саламяныя. І думаў—праўду-ткі чалавек кажа, супроць яе нічога не скажаш. Аднак...

— Усё-ж ткі, Іван Іванавіч, прыгожыя словы часам трапляюцца там... Можна сказаць, нават мудрыя словы. Чытаеш іх, думаеш, што к чаму... Нездарма-б тыя словы, здаецца?

— Гэта вы правільна, што нездарма... Прыгожыя словы, што і казаць. Звычайным словам чалавеку голаў не атуманіш. Таму й патрэбны былі яны, гэтыя словы прыгожыя, ды яшчэ залатымі літарамі друкаваныя, каб ямчэй на чалавечыя плечы ярмо ўсцягнуць, пад багатую праўду іх падначаліць, плечы гэтыя самыя. Ды пакорліваесці іх навучыць, каб лепш шыі гнулі перад багатымі... Але механіку гэтую не адразу пасцігнуць можна... Больш уважліва трэба да жыцця ставіцца, ізноў-жа і ў разумных людзей, у вялікіх людзей навучыцца можна.

— Гэта вы правільна. Іван Іванавіч. Пра розум гэты самы. Не адразу даецца ён... Але-ж, выбачайце, колькі-то часу адняў у вас на пустыя мае разгаворы. Люблю пагаварыць я, так што выбачайце 'шчэ раз... Не крыўдуйце...

— Дык што вы... Я рады заўсёды, калі чалавек да мяне загляне. А вы заходзьце, учашчайце, калі, канешне, ахвоту маеце.

Лаўрэн старанна дзверы прычыніў, забыўся і шапку тую надзець, памацаў яе ў руках у самых сенцах і там ужо прыкрыў у поцемках сваю лысіну. Шоў ад хаты крыху ўзрушаным, здзіваваным.

— Усё-ж, можна сказаць, слова новае ўчуў, нейкае новае слова. Паслухаць—яно, канешне, цікава... Выходзіць, відаць, глыбей папа тое дзела йдзе, не ў камілаўцы, відаць, справа ўся схавана...

Іван Іванавіч, спраўляў сваю вячэру, на камянку бульбу варыў, чайнік прыставіў. Ужо святло патушыў, клаўшыся спаць, як пастукаў нехта ў шыбку з вуліцы. Узняўся, прыслухаўся—крыху тугаваты быў на вуха. Нехта настойліва, несціхаючы стукаў асцярожна ў акно. Падышоў.

— Адчыніце, Іван Іванавіч...

— А па якой вы, чалавека, справе?

— Пасля... Адчыніце хутчэй, бо змерз зусім, на марозе тут стоячы...

— Хто-б то такі да мяне справу мае?—падумаў Іван Іванавіч і пашоў адчыняць квортку.

Шоў Цупрон да Сілівона, усё стараўся надаць сабе выгляда суровага, на людзей пазіраў на сустрэчных, нібы хацеў паведаць ім аб такой-жа важнай і неадкладнай справе, ускладзенай на яго, Цупронавы, плечы. Але чым бліжэй падыходзіў да зяцевай хаты, тым больш губляўся баявы цупронаў настрой, і ўжо зусім змітрэнжыла яго здрадлівая такая звадыянкая думка, а ці не лепш яму, Цупрону, павярнуць у тую вулічку-бакавушку, дзе за старымі клянамі жыве кум Панкрат. Баба ў яго дужа старанная і руплівая. І вялікі, дарэчы, спец на грачышнявыя блінцы, вот-бы паласаваццa днём святошным. У сваёй-то, у Палажкі, не разласуешся, больш аб сваіх вантробах клопат мае, а яму, Цупрону, і крупені нябеленай хопіць, і на хлебе ён вытрываe. Не вялікая, можна сказаць, птаха, зноў-жа й крыві не панскай, каб гэта дзе старому дурню прысмакі яшчэ. І ўжо самасільна нага павярнула ў завулак—не рауную чы конь той стары, не гледзячы любую паваротку знойдзе—але траіла насустрач малое Панкратава.

— А вы да нас, дзед Цупрон? А татка на базар паехаў, а мамка як пашла на завутраню, дык ішчэ не прыходзіла. Мусіць то і абедню адстоіць...

Аж дрыжыкі прахапілі старога ад завутрані тае. Не малое, а перст, можна сказаць, божы, знаменне, не раўнуючы, ад саплівай.

— Крый божа, даведалася-б мая пячэра, што я да Панкраціхі залучыў—былі-б мне блінцы, нябось на тыдзень хапіла-б аржанікаў...

І падлыпаў далей да Сілівонавай хаты.

— А ўжо дамся я ў знакі...

Не пра дачку думаў, не пра крыўды тыя Палажчыны, а пра турботы свае, пра залішнія свае клопаты.

— Я ўжо яму пакажу, як добрага чалавека трывожыць, жысць яго сямейную парушаць.

Храбрыўся чалавек, думкамі весялосць падаграваў, надаваў імпэту, меркаваў, як гэта ён, Цупрон, на Сілівона насядзе.

— А ну-ка, чорт безбароды, дай-ка я на табе кулакі свае ўзважу за маё, можна сказаць, дзіцё адзінаўтробнае... Хіба-ж то закон такі, каб чалавека бічаваць. Хіба то чулі дзе людзі, каб спакой той трывожыць, Палажку на мяне напушчаць, тыгру тую, не раўнуючы, лютую...

Так і парог пераступіў. Старанна лапцямі шморгаў ля парога, венікам абіваў, каб снегу лішняга не занесці ў хату. І тады ўжо, агледзеўшыся, дзень добры даў.

— Здароў, здароў, дзядзька Цупрон... Якім гэта цудам вас да зяця занесла? Ці не ў вас там непуцяшчая мая?

— Уга! Дзе ты бачыў... Не бачыў я яе, здаецца... Відаць у нас.. Няйначай, як у нас...

— Ці не жаліцца яна пабегла да вас? Вот-жа кабеціна на маю галаву...

— Што і казаць, чалавеча... Бабы—яны дыявалы... З бабамі век пражыць—ліха пабачыць... Чаго, чаго, а ліха—яно, браце,—стае... Але ты не зважай, чалавеча... Папусціся вот толькі ім—на голаў сядуць... Не раўнуючы, як у мяне... Так і рымсцяцца, так і рымсцяцца, каб табой круціць, жыцейку тваю муціць. Аднае і ўцехі тае ў мяне засталося: пачакайце вот, ліха вашай матары, згарну рукі—пакукуеце. Што і казаць, чалавеча, толькі гэта ім папусціся ты, дабра сабе не прычакаеш...

— Гэта ты, дзядзька Цупрон, правільна... Аднае мы тут думкі з табой...

Не з гаворкіх Сілівон. Выцісне слова, маўчыць. Сядзіць ля стала, гамзюрысты такі, надзьмуты, як бычок той суседскі—не падступіся. Сарочка на ім святошная, вышываная—колісьці то вышывала Аўгіння, замуж выходзячы. На сарочцы камізэлька яркая, у клетачку жоўтую ды чырвоную. Чабаты новыя, сырамятавыя, дзёгцем ад іх патыхае на ўсю хату. Спраўны чалавек Сілівон. Нават лысіну вун зачасаў, блішчыць алеем намазаная, смашна так набліскваe.

— Мусіць то каноплі вядуцца 'шчэ ў цябе, чалавеча?—запытаў Цупрон, на лысіну тую зірнуўшы.

— Ды 'шчэ колькі тых гарцаў ёсць...

— А ў мяне, дай ты рады з капэляй маёй, калі 'шчэ вытхаліся канапелькі тыя. Было 'шчэ лубачак з пару семя льнянога, вы-

ціснуў у піліпаўку, дык тады-ж і з'елі. Дзе ты яго набярэшся, каб яго ды неўжадобку з процьмай маёй, усё посніцай так і перакідаемся, каб да вясны сяк-так перабіцца. Тады ўжо хіба парсючка якога заб'ем да вялікадня. А цяпер, чалавеча, прыелі ўсё: і хлеб, і к хлебу. Ды яно, сказаць, і хлеб адзін—прыедлівы, дужа, браце мой, прыедлівы.

Сказаў Цупрон і падумаў: а дужа гэта трэба мне ў гаворку ўкідацца ды пра сваё: хіба чужая болька яму баліць. Чужому возу, як той казаў, не цяжка...

А Сілівон пра сваё думаў. Думаў і непакоіўся.

— Насланне ды й годзе з сваякамі гэтымі. 'Шчэ, крый божа, помачы будзе прасіць... Старайся тут, каб раскідацца потым на кожнага. Але-ж гэта ў мяне не задужа, не на таго напалі... Прышоў вот нытра старая, нытрыць, нытрыць... Не табою яно тут пакладзена што...

Трывожыўся. Пазіраў з апаскай на Цупронаў твар, на яго нос прыціснуты, на ўскудлачаную бараду. Пазіраў сваімі вузенькімі бязбровымі вачанятамі, мыляў губамі ад трывогі той, непакою.

Але-ж нічога не казаў пра хлеб Цупрон. Нават папракаў у думках сябе: трэба-ж мне, гіцалю старому, перад кожнаю нелюддзю гіньдзіцца, як-бы вот і хлеба таго куска век я не бачыў, смаку яго не спытаў. Каб перад кожным гадам ды шапку скідаць. Не дажджэ... Тут ад Палажкі той хапае... Але-ж то сваё... А то сядзіць, як глёк паліваны, бач ты яго, прыхарошваецца, алею на галаву наліў, дык думае, што яно й што-небудзь... І пыса тая голая, як у жабы... Дзіва то, Аўгіння жаліцца... Потым яна рацыю мае аб чалавеку гэтым, кажучы так. Дужа-ж нелюддзю ад яго нясе...

Не казаў пра хлеб Цупрон, і думкі тыя ўсцішыліся трывожныя Сілівонавы. Пазіраў у акно, на плот, што стаяў за акном. Угрэты сонцам пачаў брацца на жужаль снег пад плотам. І відаць было, як падгніў плот ля зямлі, шчылаватым стаў—будуць па вясне парасяты ў агарод лазіць. Няйначай як прыдзецца падправіць плот, жардзя прыстарацца ды выкінуць каторыя трухлявыя. Дубовых-бы вот калкоў яшчэ трэба. Ці мала чаго 'шчэ трэба чалавеку жывому... Хата вот у мяне, здаецца, добрая хата, колькі то год 'шчэ прастоіць. Не з гарбылёў якіх зрублена кожнае бервяно,

як звон, колькі ўжо год стаіць, а смалой усё сцякае. І печ, не раўнуючы, як з камня злітавана.

На тую печ і Цупрон вокам кінуў.

— Што не кажы, чалавеча, а печ у цябе печ... Яна, браце мой, і хату пераможе... Век веку падасца, а печ будзе стаяць...

— Будзе стаяць...—адказаў Сільвон. І тут агарнуў яго жаль, за сябе, за жытку сваю, за долю. Так агарнуў, што думкі тае не стаіў, чалавеку выказаў.

— Будзе стаяць яна, печ... Нідзе дзенецца... Вот-бы толькі да печы гэтай ды гаспадыню, як след... Каб усё яно гэта—і мая жытка, і не жытка—ды пры адным мейсцы, не раўнуючы, як печ гэтая... Каб яна, тая жытка, шчылічамі не бралася і ў роскід не шла, куды каторая... Ты вот старайся, сілу сваю ў печ укладай, у хату, у поле, і ў буйнае тое і ў дробнае... А рукі збярэш—і паехала яно, і рассыпалася, як з таго рэшата дзіравага... Бо не будзе вока на яго, гаспадарлівага ды кемлівага... Ды такога, каб вока той клопат мой мела, каб у вока таго з памяці не сыходзіла, што ўсё гэтае дабро да маімі рукамі прыдбана, рупнасцю маёй, маймі клопатамі. І каб яно паважала мяне, родным лічыла, ды к майму бервянцу свае надтачыла-б... Ото-б парадак быў-бы тады, і 'мо і я тады, рукі сцяўшы, меў-бы той супакой сапраўдны, не цягнуў-бы турботы свае туды, пад крыж... І крыж-бы меў тады з покрыўкан, каб ні дождж яму, ні нягода яму, ні мачыла яго, ні сушыла яго...

— Што ты, чалавеча, пад крыж, пад крыж... Ты, чалавеча, яшчэ з паўсотні год 'мо працягнеш, 'шчэ надакучыць табе, чалавеча, тым часам... Бач ты, шчокі ў цябе як наліваныя, ядраныя шчокі. Твар, можна сказаць, як рыжок, аж гарыць...

— А гэта я к таму, дзед Цупрон, што няма мне ў сям'і ўцехі... Няма, каб род мой далей цягнуўся... Няма, каб хто словам любым да мяне ўспомніў, каб дабро маё па праву спажыў да прымножыў. Вот-бы, як у брата майго, Хвядоса. Расце чалавек і родам сваім і гаспадаркай... А ў мяне вот няма, каб гэта па праву...

— Дужа з таго клопат вялікі. Абы самому жылося. Аб чым то думаць?

— Як то думаць? А хіба-ж праца тая будзе спорыцца, калі ты, можна сказаць, на чорта лысага робіш?

— Жонка ў цябе, чалавеча, чаго-ж бога гнявіць...

— Адно званне—жонка... Што казаць, дзед Цупрон... Канешне, дачка яна табе... Але-ж трэба сказаць, не да боку яна прышлася мне, жонка гэтая. Можа каму яна і ў радасць, можа яна каму і ў пацеху, але-ж толькі не мне... Мне-ж яна—адна прыкрасць толькі, адна хіба толькі золь тая на сэрцы... Толькі-ж сэрца гэта і знібее праз яе, чэзне без пары, без часу, злосцю тою, як іржой, набіраецца... А чаму—казаць, думаю, няма чаго, сам ведаеш... Хаты вот свае не трымаецца, па чужых дварах, можна сказаць, андаракі свае ацірае, светам маім белым круціць... Што казаць, дзед Цупрон, хіба-ж ейнае дзіцё—маё дзіцё? Ты-ж, можна сказаць, нейкім чынам свой, хаваща мне ад цябе быццам-бы і не ручыць, няма ў мяне такіх сакрэтаў, вот і кажу...

«Аб тваіх сакрэтах ведалі мы, браце, шчэ мінулым летам...»— падумаў Цупрон, усміхнуўся сам сабе. Але, набраўшыся тона сур'ёзнага, запытаў нібы вот ён. Цупрон, анічагуткі так і не ведае.

— А чаму-б то і не тваё дзіцё, скуль гэта табе, чалавека, ведама, і які ты на гэта доказ маеш?

Не зважыўся чым адказаць Сілівон. Сцяў плечы, змаршчакамі тымі над бязбровымі вачмі варухнуў, залыпаў расніцамі рудымі. Ды так, для адчэпу:

— А ўжо-ж, ведаю... Калі бязульствам займаецца, як-жа гэта не ведаць.

— Бязульствам, кажаш? А ты-ж мужык, павінен управу майсці... Вядома, дачка яна мне... Дачка яна, дачка, а канешне кабеціна. А яны, браце, роўныя ўсе, скінь вот толькі аброць з яе, з каторай... А таму, браце, трымаць трэба брытанымі, спуску ім не даваць, каб ёй каторай не дыхнуць, не адумацца.

Аж смеласць надышла на Цупрона, калі захапіўся ён справай гэтай жаночай.

— Я вот, чалавека, сваім не даю спуску. Чуць што, я, браце, за чубы іх... Я, браце, у зубы ім не гляджу, даводжу такі да парадку. Вот Палажка ў мяне анодысь... І так гэта, і гэтак... Адным словам, усхадзілася, як дзяжа хлебная. Дык я, браце,—тут дзед Цупрон і брывёй не маргнуў—дык я, браце, яе за макаўку, ды за чуб... Цягаў, цягаў, браце, покуль рука не самлела. Запарыўся аж, рукі абіў...

Апрыкрыла тут брахня тая Сіліёну. Адрэзаў:

— Відаць, як ты да парадку іх даводзіш. Ці не цераз тое і барады рашыўся, дзед. Унь адна палавіна толькі, а другая як агнём сасмылела. Спрытныя аднак у цёшчы мае рукі...

— Што ты, чалавеча? Ты пра бараду не кажы, барада ў мяне кожную вясну ліняе. Вот так і ліняе, проста табе жмутамі цэлымі і сыплецца...

— Аднак, хутка яна ў цябе зусім выліняе... Скажу табе: балабон ты, дзед, пусты балабон—і ні звону таго, адны шчарбыліны—лапаніць па пустому. Скажу яшчэ: жыцця ты, дзед, не разумееш, ніякага аб ім у цябе паняцця... Інтарэса свайго ў жыцці не маеш, дзед, няма табе за што ўчапіцца ў ім, бо жыццё гэтае для цябе як голы бубен, як далоня вось гэтая, паспрабуй зачаніцца... А ты мяне вучыш... Што ты мяне навучаць прышоў?

Усердаваў нанат Сіл'вон. І злосць тая усё буяла, разрасталася. Аж за сталом тым прыўстаў, рыпнулі боты, дзёгцевыя, сыраматавыя.

— Калі цябе падаслалі, ты й кажы, нечага са мной у дурыкі гуляць. Ён Палажку ўшчувае... Ён сям'ю трымае ў руках... Табе, старому чорту, апошнія валасы павыскубуць хутка, на подпіркі тыя... А ён па-а-вучае... За чым прышоў, гаварыў!

Зніцыўся тут дзед Цупрон, шапку сваю злямчыў, усе пазыцыі свае здаў.

— Не злуй, чалавеча, не злуй, кажу... Хіба я вінаваты ў тым... Ну, паслалі... Ну прышоў... Прыпякуць, чалавеча, дык тут да чорта ў пекла падасіся... Ідзі, Палажка кажа, да таго гада печанага, ды каб тыя апошнія валасы здзёр, дайся ў знакі яму, каб ен ведаў, як з маім родным дзіцём абыходзіцца... Каб ён, кажа, колюдзь тая, крывёю заліўся...

— Ідзі, дзед, пакуль я 'шчэ сябе трымаю... Ідзі, да не аглядайся... Дужа мне гэта тут ахвота рукі свае аб цябе паганіць, спіну тваю шураваць, Палажкай абіваную...

Доўга прасіць сябе не меў тут дзед ахвоты. За шапку ды хуценька да дзвярэй. Азірнуўся 'шчэ раз.

— А дарэмна ты, чалавеча, на мяне ўзлаваў... Ты, чалавеча, не ўшчувай... Вучы, чалавеча, на розум, бо яны, кабеты, усе аднакавы. Ім, можна сказаць, папусціся толькі...

— Ідзі, ідзі, ды дзверы зачыняй, хаты мне не вышвэнджвай...

Як дуж кінуўся Цупрон у сенцы. Аж упарыўся, уся тая лысіна ўзапрэла.

— Ну й чалавеча, каб на цябе ліха. І ніякага, можна сказаць, подступа. Кожны чалавек гэта любіць, каб яму ў руку гаварыць. А хіба-ж я супроць яго казаў? Чала-а-век... Але-ж і навучыў... Ну й навучыў... Каб такіх прыгод ды па сем на год... Аднак, схадзіў... Цяпер Палажцы маёй няма чаго рыпацца. А калі што, няхай сама паспрабуе ліха таго вызнаць...

І толькі гэта Цупрон квортку адчыніў ды на вуліцу бараду выпусціў, а насустрач ураднік з Банадысём. Памкнуўся быў Цупрон назад, каб бараду сваю за шула схаваць,—ахвота гэта вялікая з ураднікам справы мець—але спазніўся.

— А вось і паняты нам. Дужа там чаргі пілнаваюцца... Святым нём, дык яно ўсе людзі—куды каторы... Дык ты, Цупрон, з намі жо... Шчэ каторага возьмем, ды й на балацянішча.

— Можа вы мяне, браццы, аслабанілі-б як... Ізноў-жа... жыўцом мяне жонка з'есць, бо й так я забавіўся...

— Нічога, чалавеча, цэл будзеш.

Шоў Цупрон услед, бараду чухаў, свету таго божага не бачыў.

— Ну й вязе... Так-жа вязе... І ўнесла-ж мяне нялёгкая ў чужыя клопаты... У чужыя дзялы, можна сказаць, убіўся...

8

— Дык гэта вы, Іван Іванавіч?

— Я...

— Каваль?

— Каваль...

— Сапрыёнаў?

— Так...

— Ну дык я тады распранацца буду.

Іван Іванавіч яшчэ раз агледзеў гэтага чалавека. Быў ён рахманы нейкі, вяртлявы. Ці то зд маладосці свае, ці то з другіх тых прычын якіх, хто яго разбярэ. Калі і маладосць, дык не першая, доўгія рудыя вусы звешваліся ўніз і пабліскваліся ад газоўкі ледзяныя сусолкі на іх. Чалавек старанна абіраў іх, тупаў нагамі ля парога, каб снег абшь, ногі сагрэць завіхаўся ля камянка, рукі грэў. Але-ж не скажаць, каб дужа да тае печы ладзіўся, дык не: башлык адкруціў, здзеў каптан, да стала падаўся.

— Аднак-жа, і холад на дварэ, аж да самых касцей дабірае... А ты, чалавеча, чаго стаіш да газовачку тую ў руцэ трымаеш? Ты, браце, яе на стол стаў, ды сядай вот бліжэй... Ды пастой, сесці яно, браце, не дзіва ў цяперашнія часы... Не пашкодзіла-б мне, здаецца, з мароза ды цёплае тае вады стакан які ўхапіць... Мэ' прыстараўся-б як, згатаваў-бы тым часам. А я... я чалавек не горды, я й пачакаць магу...

— Але...

— А ты, чалавеча, без але... Пасля гэта, братка, пасля... Я-ж цябе наскрозь бачу. Вот стаіць чалавек, лыпае вачмі з просыпу, ды и думае: што то за халера такая ў хату ўбілася, ды 'шчэ муштраваць мяне збіраецца... Дык, братка, пасля. Пэўна-ж, братка, у цябе не ўчастак, каб гэта дакумантаў пытаць, пашпартам там, скажам, цікавіцца. Дык ты, братка, чаю гэта на жывую хоць-бы сабе нітку тую. Ды й я пасаблю... Што табе, лучынак пашчыпаць, вады прыстарацца?

— Ды я ўжо сам...

Іван Іванавіч завіхнуўся ля камянка, корпаўся з чайнікам там ды пазіраў зрэдку на гэтага нечаканага госця. Чалавек паспеў ужо сцены абгледзець, усе тыя малюнкі з календароў, нешматлікія фатаграфіі, засіджаныя мухамі. Перакінуўся на кола веласіпеднае, спецыяльнае тое кола, паяльнае.

— Аднак, і механіка ў цябе, я скажу, адсталая... Саматужная, браце, механіка... Далёка з такой механікай на папрэш, не паедзеш...

Да кніжок дабраўся, што на лаве стопачкай складзены. Рыўся як у сваіх, перакідваў з мейсца на мейсца, ну зусім растрыбушыў тыя стопкі, парадак парушыў, пры якім былі складзены кніжкі.

— Гэта я люблю... Дужа люблю... І цябе, можна сказаць, паважаю, калі ты чалавек ды ад граматы ўсур'ёз, калі вочы на кнігі свярбяць. Гэта харашо... вот—Горкі ў цябе тут—важнецкі, браце, пісьменнік. З ім, браце, дзялы можна ладзіць, наш ён, душа яго, браце мой, незапрадажная, жыццё наша бача наскрозь, і аб ім стараецца. Яго чытаць можна, і вучыцца можна. Ты гэта прачытай калі і падумай. І тады, браце, дарога перад табой—шы-ы-рокая, шырокая... аж да самага таго сіняга мора... Па дарозе той сонца над табой, залатое, гаручае... І галоўнае, на цябе свеціць, на цябе, чалавеча. Ад сонца таго па-

вага табе, мудрасць усякая... Так, чалавеча, мудрыя словы ў кнігах гэтых, мудроныя словы. Вот ты і падумай, як гэта мудрае слова ды да нашага шэрага жыцця прыладзіць... А вот сцішкі ў цябе тут... Гэта, браце, здарма... Кальцова 'шчэ можна, а вот Феты ў цябе тут, Бальманты—ад іх і падалей можна, нязручна нашаму брату да сэрца прымаць іх блізка. «Полно спать: тебе две розы я прынёс с рассветом дня». Розы... слёзы... марозы... Чорт іх не возьме, тым часам, гэтыя розы... Тут жыццё, чалавеча, вяне, 'шчэ як вяне, марнуецца, крывёю часам сыходзіць... Вось, браце, пра што нам думаць, аб чым мазгі варушыць трэба. А розы... Яно, канешне, харашо... але ў сваю пару. Як і ўсё ў сваю пару, не раўнуючы, як для мяне чаю твайго стакан.

І калі сеў Іван Іванавіч побач за стол, каб для прыліку таго выпіць яшчэ стакан чаю, 'знікла дзесьці ўстрывожанасць аб чалавеку, аб незнаёмым і нечаканым госці. Той спакойна еў, наразаў пахазяйску хлеб, дастаў з куфэрачка каўбасы скрутак, Івана Іванавіча частаваў. Чалавек піў чай і заняты вячэрай не дужа ў гаворкі ўкідаўся.

— Ты ўжо мяне выбачай, але з дарогі я знясілеў крыху, духі, браце, падвяло, дык я больш на хлеб і налягаю. Пагаварыць-жа 'шчэ—нагаворымся...

І тады Іван Іванавіч прыгледзеўся да чалавека бліжэй. Быў твар у яго звычайны, не па заказу, як кажуць людзі. Шырокі твар, валасы на ім ёжыкам, над шэрымі адкрытымі вачмі густыя бровы, нос з барадавінкай. Бараду чалавек галіў і таму яшчэ паважней выглядалі пушыстыя пракураныя вусы. Былі яны доўгія, рудыя, нібы прасмалёныя нечым крыху. Не было за імі асаблівага догляду і таму звісалі яны, заміналі, відаць, есці і чалавек раз-па-разу адкідаў іх пальцам вялікім, гэтак зподнізу, пракураным збітым кіпцем. Рукі былі пляскатыя, з такімі-ж пазбітымі пляскатымі пальцамі, у чэрнядзі той, прасмаленымі.

— Відаць ля жалеза чалавек ходзіць. Мо' ля машыны, мо так... Прамазучаны...

— Ну, а цяпер, Іван Іванавіч, паважаны каваль Сапрыёнаў, нам з табою і класціся можна. Ты гэта на ложку? Ладна, а я хіба на печ падамся, адагрэюся там з дарогі. А цябе, відаць, нясцерп бярэ, што за нахаба наляцела ў хату. Няма і ў мяне ахвоты трывожыць цябе задарма. З чыгункі я, браце. Брата ты свайго, відаць, ведаеш. Ён малатабойцам быў у нас у дэпо

ранен, потым, як табе вядома, на чысцейшую работу перакінуўся, у слесары падаўся, і нядрэнны, можна сказаць, слесар з яго... А цяпер, сказаць табе, зусім на чыстую ён падаўся. Сядзіць цяпер у турме...

— Гэта ведаю...

— Так, вось і ты ведаеш. Гэта харашо. А за што ён сядзіць, цябе запытаць?

— Трохі чуў і пра гэта...

— Ужо добра, што хоць трохі чуў... А сядзіць за забастоўку, 'шчэ пад восень гэта мы ладзілі ўсім дэпо. 'Шчэ і другія каторыя рабочыя далучыліся, па лініі, па тэлеграфу. Ну, й трэба сказаць, не пашанцавала такі нам, уклеілі па карку як след, а каторыя і за краты трапілі, не адзін ён там, брат твой. Мне-ж сяк-так пашанцавала да пары, да часу. А цяпер, браце, крута. Народ ізноў усхадзіўся, ну й населі на нас цяпер, ну проста дыхнуць не даюць. Ды штодня арышты. Ды так прыпяклі, што на якую часіну і хавацца трэба, перачакаць які тыдзень—другі. Не таму, што скуру сваю зратаваць... А зловяць без часу, карысці для нас, для ўсіх, ну, проста сказаць, аніякае. Вось і падаўся я, браце, да цябе, у тваю кануру. А мо' як і перачакаю... 'Шчэ ранен угавор з тваім братам быў. Калі крута, кажа, будзе, дык махай у мястэчка, брат там мой, Іван Іванавіч, з кавальства хлеб мае, мужыкам лемяхі наварвае, а чалавек ён свой, не выдасць воўку ў зубы, хоць, кажа, мой Іван Іванавіч трохі і недарэка і як зашыўся ў бярлогу—баіцца ў людзі падацца. Дык вось, Іван Іванавіч, справа якая прывяла да цябе. Раскошы мне не трэба, грошы, браце, сякія-такія ёсць. Прыдбаем як-небудзь і хлеб і да хлеба.

— Ды гэта ты ужо кінь. Вот зваць як цябе?

— А заві хіба Карнеем... Імя, бачыш, такое цёплае і харошае, у самы корань глядзіць, глядзіць і не пытае... Аднак і загаварыліся мы з табою. Дык ты, браце, кладзіся спаць, ды й я на верхатур'е тваё палезу.

Але 'шчэ доўга гаварылі. Пра дэпо, пра брата Івана Іванавіча, пра вайну, пра жандараў—«гарцаюць гады як сабакі па лесе—ні ўшчунку ад іх, ні ратунку чалавеку рабочаму». Ужо раз і два зашастаў пад печчу крыллем певень Івана Іванавіча, аж шыбы тыя зазвінелі ад гарластага голасу.

— Што ты гэта? Ці не гаспадаркай абсеў, да курэй дабіраешся?

— Не... Гэта, бачыш, для вясёласці трымаю. Жыве ў мяне пявун сіратой поўнай. Абодвыя, можна сказаць, бабылі мы з ім. А ўдвох весялей. Ізноў-жа і гадзіннік часта псуецца, а ён табе не падманіць, весялун мой падпечны...

— Хіба толькі так...

І рукамі айцец Панфіл замахаў і рукавы тыя як крыллі: шалех, шалех...

— І не думайце, чады... І не прасіце...

Аж бараду тую падкідаць сваю стаў, згроб у лапу ды падкідаў подкідам лапушыстую...

— Хіба-ж мае ён права на плод які? Не нашае зямлі чалавек... Не ў правах чалавек... У ваенным палоне... Ізноў-жа, калі падумаць, не наскае ён веры, можа яму ксяндза патрэбна, можа яму яшчэ чорта лысага, выбачайце, трэба...

— Нам, бацюшка, хоць-бы й чорт, хоць бы й лысы... абы рыза на ім да крыж...—адрэзала са зла Таццяна ды ў вугал аж сплюнула. Хацела нешта яшчэ рукамі дадаць, але былі тыя рукі клопатам звязаны, дзіця трымалі, у пялюшкі заверчанае. І ці таму, што дзіця тое раздзіралася крыкам, аж нос той—бубачкай—пасінеў, брала злосць Таццяну. І на папа—іш зараза, ні прыступу... І на Янука—стаяў той, нерашуча тупаў на месцы, было ўсё ў навіну яму, упярвіну даводзілася бачыць так блізка папа праваслаўнага.

— Гэта пастар, гэткая-ж барада апостальская... І кулакі...— скасавурыў вока на шырокія рукавы.—І словам божым можа, ну а ляпне дзясніцай—адразу дух ка госпаду... Важнецкі пастар, што і гаварыць...

Таццяна локцем падштурхнула Янука, прагудзела ўсе вушы:

— Кум-жа ты, не хто іншы, дай рады папу...

Але дзе ты да гэтага пастыра прыступішся. А той усё сваё:

— Дык вы й не думайце... Канешне, хрысціяне вы, і думкі добрыя ў вас, каб гэта чалавеку дапамагчы, але-ж не магу... Што не магу, дык не магу... Ніякага права не мае ён на плод...

— Што вы, бацюшка, плод ды плод, калі гэты плод, можна сказаць, хлопцам вышаў... Адно—ахрысціць толькі... Вам гэта не ў труд... Ізноў-жа за труд...

— І не гавары, мая кабета... Нічым я не супроць Ганны... Ізноў-жа і Язэп—аўстрыяк—ха-а-рошы чалавек, працавіты чалавек... Але-ж католік ён, палонны ён... Не магу я тут без кансісторыі... Калі ўжо на тое пайшло, запытаю вот, як там скажуць...

І ліха тое ўссела тут на Таццяну.

— А млын трымаць—пыталіся вы ў кансісторыі? А да баб чужых падалы мацаць—раіліся? А пападдзю біць мо' да архірэя ездзілі?

Ледзь барады сабе не выдзер айцец Панфіл ад мятушэння таго, ад знявагі нечуванае, бабскае звеганіны, дай ты ёй рады...

— Май ты бога ў сэрцы, чада маё... Ці так-жа добрыя людзі справы робяць, каб без нажа чалавека рэзаць? Ды такія-ж словы непрадуманыя... Хіба-ж так людзі да ладу даходзяць, ды ўшчэ з сваім духоўным настаўнікам... Трэба ўсё да ціхамірліва, любамірліва каб... Мы й падумаем, мазгой паварушым, а мо' яно й на лад пойдзе, мо' яно на ўцеху вам выйдзе...

— Вы сабе як хочаце, так і думайце, а ў мяне слова да вас будзе простае: дзіцю трэба хрысціць, дзіця не пыталася ў бацькі, якога ён цара пілнуецца і які яго поп хрысціць павінен... Нехрышчонікам-жа яно не будзе, як вы сабе хочаце... Мы й пакінуць вам яго зможам, калі не дасцё вы тут рады...

Пацерабіў айцец Панфіл бараду крыху, рукамі развёў,—што *ты зробіш тут.*

— Дык пойдзем хаця, чады... У пакойчык той, у баковачку.

Доўга чашу тую—місу вялікую—ставіў, вадой наліваў. Нехаця сабіраў прычандалы, крапідлы, пэндзлікі, аж крахтаў, нацягваючы эпітрахіль.

— Дык станавіціся хаця, пачынаць хіба будзем...

Нудна маліўся айцец Панфіл. Углядаўся ў столь—падапрэла там пара дошчак, прыдзецца выкінуць, няйначай. Пазіраў у акно—корпалася пападдзя ля плота—то-ж неўтаймаваная, соўдаецца заўсёды, як непрыкаяная, паплёвішча людское...

— Ну, дык плюньце хаця?

— Гэта мы могам... Так-бы вы, бацюшка, даўней... А то не магу, ды не магу...

— Не ўвадзі ты, чада маё, ў грэх мяне... Ідзіце ўжо хаця да Язэпа, сына яму нясіце, ды дарогай-жа дзе з рук не выверніце... Бо з такім імпэтам...

Не паспеў дагаварыць айцец Панфіл, як тыя ўжо з хаты вымеліся. Шлі аж уподбежку, каб дзіцё лішне на марозе не трымаць. Пармірґвала Таццяна Януку:

— Бачыш, далі такі рады... Але-ж і кум з цябе, трэба сказаць. Чаркі ты, браце, добрай не варт. Скажу вот хіба ўжо Язэпу ды й Ганне, як ты папа напужаўся, з языка з'ехаў... Але жарты жартамі, а калі мы твайго папасём хрысціць? Хіба-ж вы зломкі з Насцяй?

— Ат, адвяжыся ты, назола...—мармытнуў Янук, думаючы аб нечым, аб сваім, аб сукрытым.

Айцец Панфіл доўга не мог давесці сябе да ладу. Усё хадзіў па пакоіку, перабіраў валасіны пакручастыя ў барадзе, лаяўся:

— Ну, й ну... Не жанчына, а казня табе егіпецкая...

Ці то аб пападдзі думаў, ці аб Таццяне той, аб куме Язэпавай.

— Чыстая табе Аўстрыя, не язык, а арудзія, даруй божа..

Відаць было, думкі мітусіліся на Таццяне, на Козішкінай. Гэтакай-жа несусветнай дзяўчыне.